№ 44 (594) 27 лістапада 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

**«Мы павінны разьняволіць чалавека»**

Лукашэнка памяняў рыторыку.

Старонка 3

**КГБ працягвае выяўляць экстрэмістаў**

Справа з канфіскацыяй дзесяці асобнікаў «ARCHE» разьвіваецца.

Старонка 4

**Як людзі выкручваліся**

зь фінансавага крызісу ў XVII стагодзьдзі?

Старонка 9

## У НУМАРЫ

**У Дзьмітрыя Паўлічэнкі інсульт?**

Рэдакцыі незалежных СМІ атрымалі ананімны ліст аб тым, што скандальна вядомы палкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка трапіў у бальніцу. **Старонка 3.**

**Шукайма беларускага Абаму!**

Піша Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 5.**

**БАТЭ прайграў. Слава БАТЭ!**

Піша Зьміцер Панкавец. **Старонка 14.**

**«НН», «ARCHE» працягваюць турнэ:**

Віцебск, Глыбокае, Наваполацак, Горадня

**30 лістапада, 14.00. Віцебск.** Даведкі праз т.: (029) 651-32-53, 517-32-53.

**У той самы дзень 19.00. Глыбокае,** у касьцёле.

**1 сьнежня, 19.00. Наваполацак,** Таварыства беларускай мовы.

**4 сьнежня, 18.30. Горадня.** Памяшканьне Таварыства Беларускай Школы на вуліцы Будзённага, 48а.

Спатканьні будуць прысьвечаныя розным сюжэтам. Будзе прэзэнтавацца Збор твораў ксяндза Адама Станкевіча, што выйшаў у выдавецтве ARCHE, адбудуцца прэзэнтацыі нумару часопісу ARCHE, прысьвечанага Вялікаму Княству Літоўскаму і дарасейскай гісторыі Беларусі. Будзе працаваць выстава беларускіх кніжак. Запрашаюцца ўсе ахвотныя.

# Пройдзены этап

«НН» і «Народная воля» вяртаюцца ў «Саюздрук» і «Белпошту». **Старонка 2.**




**Незалежныя выданьні выстаялі, дзякуючы сваім чытачам і распаўсюднікам. На фота: жанчына прадае газэты на вуліцы Менску.**

## Эўрасаюз, толькі бяз членства

Эўракамісія прапануе Беларусі спакусьлівае пагадненьне аб асацыяцыі і супольным рынку. Для гэтага краіне трэ будзе пераняць усе заканадаўчыя акты ЭС і прызнаць вэрдыкты Эўрапейскага суду. Бюджэт Усходняга партнёрства складзе 2,1 млрд эўра.

Эўракамісія мае намер прапанаваць шасьці постсавецкім краінам, у тым ліку Беларусі, заключыць пагадненьне аб асацыяцыі і стварэньні новай эўрапейскай эканамічнай зоны, якая павінна стаць базай для разьвіцьця агульнага ўнутранага рынку.

Цяперашняя формула Ўсходняга партнёрства — «27+5(6)». Паўнавартасны ўдзел у ім Беларусі пакуль пад пытаньнем. Рашэньне адносна Беларусі будзе прымацца вясной у залежнасьці ад дэмакратычнага прагрэсу краіны.

Сваім праектам Эўракамісія адказвае на ініцыятыву Польшчы і Швэцыі аб пашырэньні супрацы з Армэніяй, Азэрбайджанам, Беларусьсю, Грузіяй, Малдовай, Украінай.

У праекце прапановы Эўракамісіі зазначаецца, што новыя пагадненьні аб асацыяцыі будуць падобныя на дакумэнты, падпісаныя зь Літвой і Польшчай перад пашырэньнем ЭС у 2004 годзе, але ня будуць утрымліваць пляніаў пра сяброўства ў Эўрасаюзе. Між іншага, пагадненьне заклікана заявіць пра салідарнасьць ЭС і заахвоціць эўрапейскія памкненьні краінаў Усходняй Эўропы.

Так, пагадненьне прадугледжвае стварэньне адзінай зоны свабоднага гандлю для разьвіцьця супольнага ўнутранага рынку, падобнай да Эўрапейскай эканамічнай зоны, якую сёньня ЭС дзеліць з Ісьляндыяй, Ліхтэнштэйнам і Нарвэгіяй.

Для гэтага шэсьць постсавецкіх дзяржаваў павінны будуць пераняць усе заканадаўчыя акты ЭС і прызнаць юрысдыкцыю Эўрапейскага суду.

Эўракамісія прапануе адкрыцьцё візавых цэнтраў для атрыманьня шэнгенскіх візаў, паступовае спрашчэньне візавага рэжыму і зьніжэньне цаны візаў, а ў доўгатэрміновай пэрспэктыве — увядзеньне бязьвізавага рэжыму. Бюджэт Усходняга партнёрства складзе 2,1 млрд эўра, без уліку страты 75 млн эўра ад адмены візаў.

Для арганізацыі энэргетычнай бясьпекі ў прапанове прадугледжана падпісаньне мэмарандуму, каб энэргетычнай транспартнай сыстэмай сумесна маглі кіраваць пастаўшчыкі, транзытныя краіны і спажыўцы.

Чакаецца, што 3 сьнежня прапанова Эўракамісіі будзе афіцыйна абнародавана, а 11 сьнежня — уключана ў палітыку ЭС на Эўрапейскім саміце кіраўнікоў краінаў аб'яднанай Эўропы. У чэрвені 2009 году прапануецца правесьці саміт Усходняга партнёрства, а потым праводзіць рэгулярныя сустрэчы чыноўнікаў краінаў ЭС і Ўсходняй Эўропы.

Канкрэтныя прапановы пра напаўненьні Ўсходняга партнёрства Эўракамісія прэзэнтуе вясной 2009 году.

**БелаПАН**

# «НН» і «Народная воля» вяртаюцца ў «Саюздрукі» і «Белпошту»

Як гэта будзе? Што рабіць падпісчыкам? Да чаго гэта прывядзе?

Адпаведнае абяцаньне найперш прагучала ў неафіцыйным лісьце, накіраваным з Адміністрацыі прэзыдэнта ў эўрапейскія структуры.

«Беларусь сур'ёзна разглядае магчымасьці аднаўленьня супрацы з ЭС, што зьявіліся пасьля рашэньня Рады ЭС ад 13 кастрычніка 2008 году» [тут зваротны пераклад з ангельскага перакладу дакумэнту], — гаворыцца ў лісьце, пераклад якога мы атрымалі з крыніцаў у Брусэлі. «Гэтае рашэньне стварыла неабходныя перадумовы для поўнамаштабнага палітычнага дыялёгу».

Далей у лісьце цытаваліся выказваньні У.Макея ў часе «Менскага форуму», і заяўлялася: «Каб прадэманстраваць сур'ёзнасьць свайго намеру нармалізаваць адносіны з ЭС, беларускі бок: 1) пацьвярджае сваю гатоўнасьць да дэталёвага абмеркаваньня рэкамэндацый АБСЭ/БДІПЧ што да ўдасканаленьня Выбарчага кодэксу ... . 2) забясьпечыць: а) рэальную магчымасьць для недзяржаўных газэтаў «Народная воля» й «Наша Ніва» друкавацца на тэрыторыі Беларусі; б) вярнуць вышэйназваныя ў дзяржаўныя сеткі распаўсюду і ўключыць іх у дадатковы каталёг «Белпошты».

Праз пару дзён званком нас паінфармавалі пра магчымасьць «вырашэньня праблемаў распаўсюду». Газэты адразу накіравалі адпаведныя лісты ў «Белпошту» і «Белсаюздрукі».

«Народная воля» покуль мае выходзіць двойчы на тыдзень, у аўторак і пятніцу. Дамовы прадугледжваюць магчымасьць пераходу яе на штодзённы выхад. Няма і іншых дэталяў — адносна акрэдытацыі карэспандэнтаў, магчымасьці для продажу праз крамы ды іншае — якія складаюць умовы для нармальнай працы СМІ.

Нічога не гаворыцца і пра іншыя, у тым ліку рэгіянальныя выданьні, пазбаўленыя друку і распаўсюду.

**Падпісны індэкс (для індывідуальных падпісчыкаў) 63125**

**Падпісны індэкс (для ведамаснай падпіскі) 631252**

Магчыма, «НН» вернецца ў шапікі ўжо з наступнага нумару пачынаючы. У той жа час поўнае пэўнасьці няма, бо дамовы яшчэ знаходзяцца ў стадыі падпісаньня.

Маем дзіўнае адчуваньне, нібы другі раз уваходзім у тую ж раку. «Белпошта» дала нам той самы падпісны індэкс, які мы і мелі тры гады таму. Падпісны індэкс (для індывідуальных падпісчыкаў) 63125. Падпісны індэкс (для ведамаснай падпіскі) 631252.

Падпісны індэкс нашага выданьня унясуць у канец падпіснога каталёгу ад рукі на кожнай пошце.

Тое, што мы з вамі зьдзейсьнілі, — безь перабольшваньня гістарычна. Тры гады! Тры гады мы самі распаўсюджвалі газэту.

### На якіх умовах нас вяртаюць?

Палітычна ніякіх умоваў няма. Гандлю з намі не вялі. Нам проста патэлефанаваў Усевалад Янчэўскі з Адміністрацыі прэзыдэнта і паінфармаваў, што нашы «праблемы з распаўсюдам вырашаныя».

Аднак эканамічныя і юрыдычныя ўмовы вяртаньня бязьлітасныя.

Паводле дамоваў, «Белсаюздрук» і «Белпошта» будуць забіраць сабе 55% ад адпускной цаны. Хоць стварыць і выпусьціць газэту намнога цяжэй, чым яе прадаць. На прадукты гандлёвая нацэнка абмежаваная, а тут — спэкулятыўная накрутка. Ды нічога не паробіш — манаполія.

Юрыдычна дагаворы складзеныя так, каб газэты можна было вытурыць з распаўсюду ў кожны момант, а колькасьць асобнікаў у продажы — абмяжоўваць да бясконцасьці.

У дамовах прысутнічаюць тры моманты: 1) дамова можа быць разарваная, калі распаўсюд акажацца рэнтабэльным (уявіце сабе нерэнтабэльнасьць пры 55%-ай накрутцы!), але няма ніякіх крытэраў разьліку той рэнтабэльнасьці, 2) дамова можа быць разарваная пры вяртаньні больш за 30% (летась была ўцечка зьвестак пра 50%-е вяртаньне дзяржаўных газэтаў, тым ня менш, усе яны застаюцца ў кіёсках), 3) пры вяртаньні большым за 10% «Саюздрук» мае права скарачаць тыраж, які прымае на рэалізацыю.

Вяртаньне — гэта тэрмін для абазначэньня колькасьці непрададзеных асобнікаў. Мэханізму праверкі праўдзівасьці лічбаў вяртаньня няма. Калі нам тры гады манілі пра «эканамічную нямэтазгоднасьць заключэньня дамоваў», то хто будзе верыць цяпер?

Нарэшце — д'ябал хаваецца ў драбніцах — колькасьць.

«Белсаюздрук» прыняў на распаўсюд абмежаваныя тыражы — напрыклад, на Менск пойдзе ўсяго 2500 экзэмпляраў «Народнай волі» і 1400 асобнікаў «Нашай Нівы». Г.зн. у сярэднім менш за 4 паасобнікі на адзін кіёск. Разьмяркоўвацца яны будуць няроўна: дзесьці па 20, а недзе па 2. Пішам пра такія драбніцы, каб вы лепей спасьцігні прычыны і наступствы падзеі, нашы задачы і нашу лёгіку.

### Будуць сюрпрызы

Пачынаючы з наступнага нумару, газэта зьменіцца. Мы сканцэнтруем усе сілы, каб заваяваць новага чытача, каб тыя людзі, якія пабачаць нас у кіёсках, зачапіліся і сталі чытаць беларускую газэту. Будзем працаваць найперш на пашырэньне кола носьбітаў нацыянальнай ідэі. Гарантуем паляпшэньне якасьці.

### Якая будзе цана газэты?

Дзякуючы павышэньню накладу, удасца зьнізіць выдаткі. У сьнежні газэта будзе прадавацца ў «Саюздруках» за 2000 рублёў — для новых чытачоў. Не крыўдуйце, падпісчыкі, якія аплацілі за яе па 3000. Гэта быў мінімум для нашага выжываньня.

З Новага году газэта будзе каштаваць у шапіках 2500 рублёў, гэтульні ж — пры падпісцы праз Рэдакцыю, а пры падпісцы праз «Белпошту» — 3000 рублёў. Толькі ведамасная падпіска будзе таньнейшая, бо мы зацікаўленыя, каб бібліятэкі выпісвалі, а гэта ўстановы небагатыя, калі не лічыць тае галоўнае.

### Як дзейнічаць чытачам?

Мы рэкамэндуем і просім падпісвацца праз Рэдакцыю і надалей. Усе тыя, каго такі спосаб атрыманьня газэты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы. 1) Яна нам выгаднейшая фінансава. 2) Мы зможам дастаўляць Вам газэту хутчэй або з той жа хуткасьцю, што «Белпошта». 3) Лічым важным захаваць сыстэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

**Рэд.**

**Толькі 2 з 15**

Застаецца абмежаваным распаўсюд выданьняў:

«Новы час», «СНплюс. Свободные новости плюс» (падпіска), «Товарищ», «Борисовские новости», «Витебский курьер-М», «Вольнае Глыбокае», «Газета Слонімская», «Ганцавіцкі час», «Intex-press» (Баранавічы), «Газета для вас», «Бабруйскі кур'ер». Астатнія забароненыя газэты ня выстаялі трох гадоў.

## Асьцярожны аптымізм вяртаньня

З самымі рознымі пачуцьцямі мы назіралі, як з турмаў выходзілі палітвязьні, як рок-гурты з «чорнага сьпісу» пасьля нашумелага паходу ў Адміністрацыю пакрысе асвойваліся на малых і вялікіх пляцоўках. Але вось і супрацоўнікі незалежных выданьняў прычакалі — у блізкай будучыні замаячыла вяртаньне ў шапікі «Белсаюздруку» «НН» і «Народнай волі».

Вяртаньне гэтае выклікае досыць асьцярожны аптымізм. Зразумела, што такая падзея ня можа не ўзрадаваць, бо каму ж ня хочацца працаваць у цывілізаваных умовах. Зь іншага боку, застаецца шэраг нявырашаных пытаньняў, сярод якіх, напрыклад, адсутнасьць цьвёрдых гарантыяў невяртаньня да падзеяў канца 2005 году.

Дзе-нідзе ўжо прагучалі паралелі з палітвязьнямі. Маўляў, незалежную прэсу выкарысталі, як Парсюкевіча з Казуліным. Прыклад Баразенкі яскрава сьведчыць пра слушнасьць такога параўнаньня. Вядома, толькі адданасьць тысяч чытачоў, распаўсюднікаў, уратавалі астраўцы незалежнай прэсы, а акцыі і лісты пратэсту былі фактарам, які ўплываў на ўлады, аднак цяперашнія саступкі Адміністрацыі прэзыдэнта былі выкліканыя найперш намаганьнямі звонку. Таму мусім выразна ўсьведамляць, што гэтак сама лёгка можам апынуцца там жа, дзе перабывалі апошнія тры гады.

На другі плян адышоў абноўлены закон аб СМІ, які пачне дзейнічаць менш чым праз два месяцы. Між іншым, менавіта ён паранейшаму ставіць пытаньні акрэдытацыі супрацоўнікаў замежных СМІ, доступу да афіцыйнай інфармацыі (прыгадайма сумна вядомы загад чыноўнікам не даваць камэнтароў без дазволу кіраўніцтва) ды іншыя.

І апошняе. Бадай, найбольш істотнае. У падпісны каталёг на 2006 год, як вядома, не трапілі 17 незалежных газэтаў — як цэнтральных, так і рэгіянальных. Некаторыя зь іх, як напрыклад «Салідарнасьць», з таго часу перасталі друкавацца. Як ні сумна тое гучыць, але мусім прызнаць, што ня маем дастаткова сілаў, каб дыктаваць свае ўмовы тым, хто так «нечакана» павярнуўся да нас тварам. Але мусім задаваць пытаньні. 15 газэтаў былі пазбаўленыя распаўсюду. Радыё «Свабода», «Рацыя» і «Эўрарадыё» не чуваць на ФМ у Беларусі. «Белсату» няма ў кабэльных сетках. «Наша Ніва» і «Народная воля» вернуцца ў шапікі? Цудоўна! А хто наступны?

**Сямён Печанко**

## Два погляды

### Ірына Халіп: Я ня веру ў беларускіх кенгуру

Лукашэнка ўсяго толькі напамінае ўсім нам, хто ў краіне гаспадар: хоча — забараняе, хоча — дазваляе. А калі і дазваляе, то ўсё адно ня ўсім. Праз месяц-другі яму надакучыць гэтая гульня — і ў шапіках зноў застануцца хіба што «Японскія крыжаванкі». І калі Сярэдзіч ці хто-небудзь яшчэ паверыць у добрую волю Лукашэнкі — значыць, зможа паверыць і ў тое, што ў тутэйшых лясах можна ўдала папаляваць на кенгуру. Асабіста я ў беларускіх кенгуру ня веру.

**Charter97.org**

### Сямён Букчын: Яшчэ адзін урок?

Паганая эканамічная сытуацыя ў краіне прымушае вышэйшае кіраўніцтва ісьці насустрач пажаданьням Эўрасаюзу. Хто спрачаецца з тым, што заўтра ў кіёсках ізноў могуць застацца толькі «Японскія крыжаванкі»? Яшчэ як могуць! Але ж ёсьць і рэальны факт! Рэжым адступіў. Саступіў. Назавіце гэта як хочаце. Але саступка навідавоку.

Што — было б лепш, калі б «Народная воля» працягвала друкавацца ў Смаленску? Не лічу «вяртаньне» нават дзьвюх газэтаў «малой справай». Хаця і не перабольшваю гэтай падзеі.

**Nmnby.org**

## Перамога незалежнага грамадзтва

Многія з нас развучыліся жыць ва ўмовах нармальнасьці. За Лукашэнкам усё перавярнулася з ног на галаву.

Нікога не зьдзіўляе, калі затрыманых на мітынгу юнакоў садзяць «за нецэнзурную лаянку», затое лічыцца цудам, калі іх адпускаюць без складаньня пратаколу. Нармальна, калі за кратамі палітвязьні, і ўзьнікае адчуваньне падвоху, калі іх няма.

Некаторыя так звыклі, што «НН» не купіць у шапіках, што прагучалі заклікі не вяртацца ў сыстэмы распаўсюду. Ніякіх саступак злачыннаму рэжыму!..

Так, колькі мы ўжо нагледзеліся, калі пасьля аднаго кроку наперад наступалі два ці нават тры крокі назад. Сапраўды, гарантый ніякіх, але не выкарыстоўваць новыя магчымасьці было б нелягічна.

Вяртаньне — вялікая перамога незалежнага грамадзтва. Людзей, якія ахвяравалі на СМІ, якія разносілі перыёдыкі па пад'ездах у маразы і сьлёку, цягнулі валізы ў свае райцэнтры, рызыкавалі. Гэта таксама заслуга тых людзей, якія мэтанакіравана ўздымалі праблему ў міжнародных інстытуцыях.

Перад кожнай газэтай пасьля 2005 году стаяла пытаньне: працягваць ці не. А вытрымалі ж, не скарыліся! Гэтак сама як некалі адстаялі Курапаты, Ліцэй... Цяперашняе вяртаньне — праява нашай сілы.

**Зьміцер Панкавец**

# У Дзьмітрыя Паўлічэнкі інсульт?

У аўторак шэраг рэдакцый незалежных СМІ атрымалі ананімны ліст, дзе паведамлялася, што скандальна вядомы палкоўнік Дзьмітры Паўлічэнка цяпер знаходзіцца ў бальніцы. Паводле неафіцыйнай інфармацыі, у яго інсульт, ён ляжыць у рэанімацыі.

У прэс-службе ўнутраных войскаў пацьвердзілі шпіталізацыю Паўлічэнкі. На пытаньне пра дыягназ палкоўніка адказалі, што «нічога страшнага няма».

42-гадовы Паўлічэнка ад 1999 году ўзначальваў брыгаду спэцыяльнага прызначэньня ўнутраных войск. Сёлета ў кастрычніку Паўлічэнка быў адтуль звольнены. Афіцыйная прычына агучаная не была. Што праўда, ужо праз пару тыдняў ён атрымаў новае прызначэньне — камандзіра корпусу аховы грамадзкага парадку унутраных войскаў МУС па баявой падрыхтоўцы. Кажуць, што на новым месцы працы Паўлічэнка так і не пасьпеў зьявіцца.


У 2006-м Паўлічэнка выглядаў цалкам здаровым.

У 2000 годзе тагачасны старшыня КДБ Уладзімер Мацкевіч падпісаў загад аб арышце Паўлічэнкі па падазрэньню ў датычнасьці да зьнікненьня Захаранкі, Красоўскага, Ганчара, Завадзкага. Аднак зь СІЗА палкоўнік быў вызвалены па загадзе Лукашэнкі. Адразу па выхадзе Паўлічэнка сказаў журналістам, што «гатовы выканаць любы загад прэзыдэнта».

Па зьвестках «Беларускага партызану», якія зьявіліся пазьней, інсульту ў Паўлічэнкі не было, а ў бальніцы ён па асабістым жаданьні. Ня выключана, што пасьля выпіскі палкоўнік можа напісаць рапарт аб звальненьні са службы.

**Зьміцер Панкавец**

## У Жалезьнічэнкі сканфіскавалі кнігі Печанка і Акудовіча

Несправядліва выключаны студэнт Зьміцер Жалезьнічэнка, які ўжо звыш 300 дзён служыць у войску, займеў права на адпачынак. Аднак хлопцу ён будзе прадстаўлены ў самы апошні тэрмін. «Аднойчы мне прывезьлі кніжкі Печанка «Ў беларускім войску» й Акудовіча «Дыялёгі з Богам». Стаялі яны, прачытаў. І раптам бачу, што іх — няма. Я падышоў да камандзіра роты й спытаў: у чым штука? Ведаў, што свае хлопцы ня возьмуць. Камандзір сказаў, што прыходзіў наш супрацоўнік КДБ і зь Менску адзін прыяжджаў. Забралі кніжкі — і пайшлі. Куды забралі — невядома, бо бяз санкцыі. Безь нічога!» — расказвае хлопец.

**ЗП**

## «Мы павінны разьняволіць чалавека»

*Аляксандар Лукашэнка памяняў рыторыку.*

А.Лукашэнка заявіў 25 лістапада на нарадзе з актывам Віцебскай вобласьці: зьявіліся прагнозы, што наступны год будзе цяжкім, але ён спадзяецца, што Беларусь утрымаецца. «Што да беларускага рубля, то сытуацыю абсалютна можна стрымаць. Яго абвалу ня будзе, усё — у зададзеных парамэтрах, у тым ліку і гадавая дэвальвацыя», — заявіў А.Лукашэнка.

Лагодна гаварыў ён і пра супрацу зь Міжнародным валютным фондам. МВФ, сказаў ён, пазытыўна ацэньвае ўсе працэсы, што адбываюцца ў Беларусі, а дзяржава прыслухоўваецца да ўсіх заўваг МВФ.

І — нешта ў лесе здохла — была падкрэсьленая патрэба лібэралізаваць усе сфэры жыцьця ў Беларусі: «Мы павінны разьняволіць чалавека, лібэралізаваць наша жыцьцё, зрабіць яго больш свабодным для чалавека. Гэта вельмі важна ў сёньняшняй сытуацыі». Паводле словаў Лукашэнкі, трэба забясьпечыць прастор у эканоміцы, «каб людзі маглі апэратыўней і свабадней дзейнічаць, каб іх нічога ня спутвала».

Ён падкрэсьліў, што сваёй галоўнай задачай ён цяпер лічыць забесьпячэньне правоў чалавека: «Абараняць правы людзей на дастойную зарплату, на тое, каб свабодна жыць і гаварыць тое, што чалавек думае».

**МБ**



Уладзімер Макей (справа) Косінцу: «Цяжкая задача стаіць перад вамі».

## Суд у дзень распаду

Суд над моладзевым актывістам Аляксандрам Бразенкам пачнецца 8 сьнежня (панядзелак) у Цэнтральным судзе сталіцы. Гэта акурат дзень распаду СССР.

Судзіць хлопца будзе Натальля Вайцяховіч, а не Валеры Есьман, на якога легла падазрэньне ў датычнасьці да карупцыйных злачынстваў.

Алесь Бразенка — апошні герой «Справы чатырнаццаці». Ад 27 кастрычніка ён знаходзіцца ў СІЗА на Валадарскага. За кратамі хлопец правёў тыднёвую галадоўку пратэсту.

Штодня пад брамай ізалятару зьбіраюцца моладзевыя актывісты, якія выказваюць салідарнасьць са зьняволеным. Іх затрымлівалі двойчы па 15 чалавек.

У панядзелак камісар Эўрасаюзу ў пытаньнях міжнародных дачыненьняў і палітыкі суседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр заявіла, што Эўропа будзе ўважліва назіраць за гэтым працэсам.

**Зьміцер Панкавец**



Сярод затрыманых на акцыі салідарнасьці з Бразенкам былі яго родныя цётка і дзядзька. «Вам плацяць за гэта!» — крычаў арыштантам міліцыянт.

## Косінец стаў кіраўніком Віцебшчыны

Новым кіраўніком Віцебшчыны стаў віцэ-прэм'ер Аляксандар Косінец. Адпаведны ўказ у панядзелак падпісаў А.Лукашэнка.

Аляксандар Косінец нарадзіўся ў 1959 годзе ў вёсцы Роскі Сялец (Аршанскі раён). Скончыў Віцебскі мэдычны. З 1982 да 1994 году працаваў на катэдры хірургіі гэтай ВНУ. З 1997 быў рэктарам Віцебскага мэду. Ад 2005 — намесьнікам прэм'ер-міністра. Доктар мэдыцынскіх навук, прафэсар.

На гэтых выходных віцэ-прэм'ер не зьнікаў з экранаў, бо менавіта яму Лукашэнка даверыў займацца стварэньнем працоўных лягераў для пітушчых бацькоў. Паказвалі, як Косінец асабіста сустракаўся з такімі бацькамі і запомніўся фразай: «Два—тры разы спазьніўся на працу — у калёнію да двух гадоў». Не пасьпеў з адной справай разабрацца, як накіравалі на іншы фронт.

**ЗП**

Адбыліся зьмены і ў КДБ. У старшыні камітэту Вадзіма Зайцава зьявіўся яшчэ адзін намесьнік. Пытаньні эканамічнай бясьпекі і барацьбы з карупцыяй будзе курыраваць Іван Цярцель. Ён, як і Зайцаў, прыйшоў у спэцслужбы з пагранічнага камітэту.

## СЬЦІСЛА

### Нацбанк: Дэвальвацыя можа скласьці да 5%

Пра такі плян на 2009 год паведаміў намесьнік начальніка галоўнага ўпраўленьня валютнага рэгуляваньня Нацбанку Сяргей Гайко на пасяджэньні праўленьня Беларускага саюзу прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага.

Курс даляра да рубля да канца гэтага году будзе вытрыманы ў рамках 2 200 рублёў за даляр, дадаў ён.

### Колькасьць абортаў імкліва падае

У Беларусі з 1990 году колькасьць абортаў зьнізілася ў пяць разоў і складае цяпер 22,2 на 1 тыс. жанчын дзетароднага ўзросту. У 2003 годзе колькасьць родаў і абортаў была аднолькавай, у 2007 годзе суадносіны абортаў да родаў вызначаюцца як 1:2.

### Барысаўскія фаны абаранілі маладафронтаўцаў ад АМАПу

Моладзь узьняла нацыянальныя сьцягі на стадыёне ў часе матчу БАТЭ—«Рэал». Праз нейкі час амапаўцы вырвалі сьцягі з рук у хлопцаў і спрабавалі скруціць Вадзіма Ханяўку быццам бы для праверкі дакумэнтаў. Аднак барысаўскія фанаты абхапілі маладзёна рукамі і не далі яго затрымаць.

### «Рух «За Свабоду»: Спроба №4

Заява на рэгістрацыю ПАГА «Рух «За Свабоду» і ўсе неабходныя дадатковыя дакумэнты чацьверты раз перададзеныя ў Міністэрства юстыцыі.

**ЗП, АГ; радыё «Свабода», БелаПАН, БЕЛТА**

# КДБ працягвае выяўляць экстрэмістаў

Справа з канфіскацыяй на мяжы ў Берасьці дзесяці асобнікаў часопісу ARCHE разьвіваецца па гарадзенскім варыянце.




24 кастрычніка ў Берасьці на мытні сканфіскавалі на экспэртызу дзесяць асобнікаў апошняга нумару часопісу ARCHE. Іх вёз у сваім чамадане грамадзянін Беларусі Аляксандар П.

Мытніца Нядбаева Рэната Юр'еўна западозрыла, што «зьвесткі, надрукаваныя ў часопісе, могуць шкодзіць нацыянальным інтарэсам РБ». Быў складзены пратакол.

10 сканфіскаваных экзэмпляраў таўшчэзнага (1082 старонкі вялікага фармату, кожны вагою па-над кілаграм) выпуску прызначаліся польскім аўтарам выданьня (у тым нумары надрукаваная 300-старонкавая кніга маладога гісторыка Конрада Бабятынскага «Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654—1655)» і праца Рафала Ўнука пра беларускі антыкамуністычны супраціў пасьля Другой сусьветнай вайны), а таксама групе польскіх прафэсараў гісторыі — Закшэўскаму, Нагельскаму, Рахубу, — якія спэцыялізуюцца на тэмах, што абгаворваюцца ў гэтым нумары. Рэшта мела трапіць у бібліятэкі шэрагу ўнівэрсытэтаў.

На тыдні галоўны рэдактар часопісу Валер Булгакаў атрымаў ліст зь Дзяржаўнага мытнага камітэту за подпісам намесьніка яго старшыні С.Барысюка. У ім паведамляецца, што ў адпаведнасьці з заключэньнем Камітэту дзяржаўнай бясьпекі ад 5.11.2008 у №7—8 часопісу за 2008 год «была прызнана наяўнасьць заклікаў да экстрэмісцкай дзейнасьці і прапаганды такой дзейнасьці» (тут і далей — пераклад з расейскай).

Матэрыялы справы ў гэтым пытаньні былі накіраваныя ў суд Маскоўскага раёну Берасьця «з хадайніцтвам аб прызнаньні дадзенай інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкай і яе наступным зьнішчэньні».

Аналягічныя спробы прызнаць розныя выданьні экстрэмісцкімі КДБ рабіў на іншым «заходнім рубяжы краіны», у Горадні. Там таксама накіроўвалі ў суд інфармацыйныя матэрыялы, сканфіскаваныя пільнымі мытнікамі ў розны час. Сярод іх аказаліся ўлёткі кандыдата ў прэзыдэнты Мілінкевіча і розныя газэты і кнігі на беларускай мове. У дзечаў апазыцыі, унесеных у сьпісы на пераtрус, папросту адбіралі кнігі, якія яны бралі на чытаньне з сабой у цягнік.

На шчасьце, гарадзенскія справы пакуль скончыліся нічым — суд завярнуў матэрыялы назад, дачапіўшыся да фармальнасьцяў. Маўляў, начальнік абласнога ўпраўленьня ДБ няправільна аформіў пазоў.

Не да сьмеху — маем справу з мэтаскіраваным запалохваньнем як выдаўцоў, так і чытачоў, з спробай спэцслужбаў вярнуць сабе цэнзарскія функцыі, мяркуе В. Булгакаў. Такая практыка існавала ў таталітарных дзяржавах — нацысцкай Нямеччыне і Савецкім Саюзе.

Часопіс ARCHE — гэта незалежнае навукова-папулярнае і грамадзка-палітычнае выданьне, у якое пішуць дзясяткі беларускіх інтэлектуалаў. Дзякуючы сваёй высокай якасьці, ён стаў адзіным беларускім выданьнем, запрошаным у сетку эўрапейскіх інтэлектуальных часопісаў Eurozine.

Рэдактар ARCHE не выключае, што яму прыйдзецца зьвярнуцца да інтэлектуалаў і культурных выданьняў іншых краінаў Эўропы з заклікам распачаць кампанію салідарнасьці.

**Мікола Бугай**

## Валер Булгакаў: Мытня і КДБ прывыклі выціраць ногі аб нас

Рэдактар часопісу ARCHE бачыць у хадайніцтве берасьцейскай ДБ аб прызнаньні нумару часопісу экстрэмісцкім матэрыялам «тупое і агіднае запалохваньне».



**— Чаму, на Вашую думку, нумар хочуць прызнаць экстрэмісцкім? Што ў ім экстрэмісцкага?**

— Па-першае, згадаю эфэкт навізны — здаецца, яшчэ ніколі ў найноўшай беларускай гісторыі штомесячны часопіс на беларускай мове не выходзіў аб'ёмам 1100 старонак і да таго ж з каляровымі ілюстрацыямі. 24 кастрычніка берасьцейская мытніца Рэната Нядбаева, канфіскоўваючы часопіс, відаць, думала, што ён яўна ня з нашай рэспублікі паходзіць.

— Гэты нумар вельмі разнастайны і наагул прысьвечаны падзеям беларускай гісторыі расейскіх часоў, г.зн. да ўваходу беларускіх земляў у склад Расейскай імпэрыі. Хочацца верыць, што ўласна гістарычны блёк ня быў кваліфікаваны як экстрэмісцкі. Экспэрты берасьцейскага КДБ маглі акрэсьліць такім чынам толькі аналіз В.Сіліцкага аб парлямэнцкіх выбарах, два матэрыялы пра выбух 4 ліпеня і, нарэшце, рэцэнзію кінакрытыка А.Расінскага на фільм А.Вайды «Катынь», дзе аўтар ставіць чэкістаў і фашыстаў у адзін шэраг.

Як на мяне, у тым, што нумар прызнаны экстрэмісцкім, вінаватыя ня нашыя аўтары і напісаныя імі тэксты. Я бачу ў гэтым праяву кругавой парукі нашых сілавых ведамстваў. Замест таго, каб выправіць відавочнае галавацяпства, берасьцейскае КДБ пакрывае берасьцейскую мытню, бо і першыя, і другія гадамі прывыклі выціраць ногі аб такіх людзей, як мы з вамі.

Я бачу тут таксама тупое і агіднае запалохваньне. Пасланьне людзей, якія гэта ўчынілі, на звычайную мову можна перакласьці так: маеш ты рэгістрацыю, ня маеш, усё роўна вырашаць, пусьціць цябе за мяжу ці не, буду я сам.

**— Што думаеце рабіць?**

— Адказам ARCHE на ўсё гэта будзе напружаная і пасьлядоўная праца. Сёлета мы выпусьцілі адзін нумар на 1100 старонак, налета плянуем ужо два. Такая ацэнка — найлепшае прызнаньне, што праца не ідзе намарна.

**Запісаў МБ**

**Зьмест «экстрэмісцкага» ARCHE**

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ Другая традыцыя. Ад рэдактара
АЛЕСЬ БЕЛЫ Лацінскі акцэнт
*аналітыка*
ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Парлямэнцкія выбары: беларуская нуда, эўрапейская інтрыга?
Выбух і шмон: беларускі міні-Асьвенцім. Круглы стол у рэдакцыі «ARCHE»
БАЛАШ ЯРАБІК, АЛАСТАР РАБАЛЬЯЦІ Менскія манэўры. Лукашэнка выкарыстоўвае выбары, каб здабыць рычагі ў перамовах з ЭС
*крытыка*
АНДРЭЙ РАСІНСКІ Памяць ахвяраў і памяць катаў
АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ Як Гронскі расправіўся над Каліноўскім
АЛЕГ ДЗЯРНОВІЧ Наўздагон. Заўвагі на палёх кнігі Анджэя Рамаюўскага «Пазытывізм у Літве»
АНДРЭЙ ЦІХАМІРАЎ Леваліберальнае асэнсаваньне беларускай ідэі
АНАТОЛЬ АСТАПЕНКА Аб беларускай нацыянальнай ідэі і так званай «беларускай інтэлектуальнай прасторы»
*гісторыя*
АЛЕСЬ БЕЛЫ Эвалюцыя палітычнага народу ВКЛ у Сярэднявечча і Новы час
ВІТАЛЬ ГАРМАТНЫ Аршанская бітва 8 верасьня 1514 г.
КОНРАД БАБЯТЫНСКІ Ад Смаленску да Вільні. Вайна Рэчы Паспалітай з Масковіяй (1654—1655 гг.)
АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК У цені Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швэцыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст.
ІРЫНА ЛАЎРОЎСКАЯ Ахвярадаўцы і ахвяраваньні ў Берасьці Літоўскім (XVII—XVIII стст.)
ЛАРЫ ВУЛЬФ Уніяцкая царква і падзелы Польшчы: самазахаваньне канфэсіі ў век асьвечанага абсалютызму
СЫМОН ЛУКОШКА 1780—1800-я гады: рэлігійная канвэрсія беларускіх уніятаў
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Праблемы з рэальнасьцю Анёла Доўгірда
ТЭАДОР Р. УІКС Русіфікацыя: словы і справы (1863—1914)
РАФАЛ УНУК Беларускае антыкамуністычнае падпольле — спроба пастаноўкі праблемы
*літаратура*
МІКОЛА ХАЎСТОВІЧ «Я, хоць і не паэта…»
ІГНАЦЫ ЯЦКОЎСКІ Аповесьць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды
*эсэістыка*
АЛЕСЬ БЕЛЫ Сага аб Палестры

# Шукайма беларускага Абаму!

Уражаньнямі аб віленскай канфэрэнцыі прыхільнікаў перамен дзеліцца **Аляксандар Класкоўскі.**

Вялікая і месцамі нэрвовая размова пад грыфам «Пэрспэктывы супрацы прыхільнікаў дэмакратычных перамен у Беларусі» прайшла 21—22 лістапада ў Вільні.

Апошнім часам улада заварушылася. Яна лібэралізуе эканоміку ды спрабуе знайсьці супольную мову з Эўропай. Хай сабе крыва, але ж працэсы пайшлі. Карацей, палітычныя апанэнты рэжыму страцілі манаполію на звыклыя лёзунгі — рынкавыя, эўрапейскія, незалежніцкія і г.д.

Потым: дэ-факта дыялёг Захаду з уладай ужо ідзе. Можна крыўдзіцца да пасіненьня, што заходнікі выявілі цынізм, што няма жаданага трыялёгу. Але крыўды ў палітыцы — марная, абсалютна непрадуктыўная рэч.

Варта гэта асэнсаваць — і знаходзіць сваю нішу, свае моцныя аргумэнты ў новым кантэксьце. Даводзіць права на ролю суб'екта палітычнага працэсу (у тым ліку і цераз самафінансаваньне, падкрэсьлівалася на канфэрэнцыі).

Аднак цяжка, вой як цяжка даць рады сьвінцовай інэрцыйнасьці мысьленьня!

Вось дакладае лідэр ПКБ Калякін: на мінулых выбарах удалося ахапіць вылучэнцамі АДС толькі 109 акругаў з 110. Недапрацовачка, маўляў. А мо варта павярнуць праблему іншым бокам? Ці ня лепей было адразу сканцэнтравацца на 15—20 акругах з рэальнымі кандыдатамі, чым расьцярушваць сьціплы рэсурс на апрыёрных слабакоў з адзінага сьпісу?

Я ўжо не кажу пра адбываньне нумару, імітацыю удзелу. Трагікамічнымі былі сытуацыі, калі той ці іншы кандыдат-дэмакрат, заціснуты ў парадыгме «здымацца/не здымацца», баяўся нават патраціць казённыя грошы на ўлёткі, каб потым не вяртаць з сваёй кішэні.

Зрэшты, годзе пілаваць пілавіньне!

Возьмем пэрспэктыву прэзыдэнцкіх выбараў. Хтосьці пярыць ідэю дзьвюх калёнаў — правай ды левай. Маўляў, паколькі камуністы ды бээнэфаўцы ўсё адно ніколі ня створаць кампраміснага мэсыджу пад адзінага кандыдата, то вылучым дваіх, на розныя электаральныя густы, а ў другім туры сканцэнтруем высілкі на падтрымцы мацнейшай фігуры.

Сьмех дый годзе!

Нагадаю: Лукашэнка сам перамог 14 гадоў таму ў другім туры. Ён выдатна памятае, як панічна беглі намэнклятурныя пацукі з Кебічавай шхуны ў прамежку паміж турамі. Так што пры цяперашняй уладзе другіх тураў ня будзе паводле азначэньня.

І калі вы хочаце зладзіць дэфіле партыйных топ-мадэляў (з доўгімі шлейфамі адмоўных рэйтынгаў), то так і кажэце. Але не сьмяшэце мае пантофлі, называючы гэта стратэгіяй перамогі.

Дырэктар Коласаўскага ліцэю Ўладзімер Колас на канфэрэнцыі ў Вільні быў адзіны, хто без эківокаў зазначыў: ніхто з партыйных лідэраў у гэтым спаборніцтве ня мае шанцаў. Але Юпітэры з АДСу сярдуюць, лішні раз выдаючы такім чынам уласныя пляны на прэзыдэнцкую кампанію.

Падчас дыскусіі многія падтрымалі і дапоўнілі высновы Валера Карбалевіча: паколькі глеба пад беларускай мадэльлю захісталася, то шанец выйграць у Лукашэнкі мае гэтакі беларускі Абама, дынамічны лідэр зь лёзунгам пераменаў. Пажадана — не асацыяваны з пэўным партыйным брэндам ды маладзейшы за дзейнага кіраўніка.

Так, і Лукашэнка сёньня дэкляруе трансфармацыю, але пасьля шматгадовага рэфрэну пра стабільнасьць гэта атрымліваецца ня надта пераканаўча. Эканамічныя перамены робяцца цераз адсяканьне хваста за некалькі разоў. Ня кажучы пра тое, што абраны кітайскі шлях аўтарытарнае мадэрнізацыі: безь пераробкі палітычнай сыстэмы.

Вось на гэтых момантах трэба і пазыцыянаваць моцную, пераканаўчую альтэрнатыву: мы ведаем, як правесьці краіну цераз крызіс ды зрабіць стабільнасьць, дабрабыт на іншым, цывілізаваным падмурку, а не на расейскай «халяве».

Дзеля гэтага варта найперш зладзіць канцэптуальны апгрэйд апазыцыйнай прапановы, каб яна стала канкурэнтнай. Бо ўлёткавы асартымэнт 1990-х на тры чвэрці вычхаўся.

Канцэптуальныя выклікі стаяць і перад іншымі слаямі так званых (тэрмін, канечне, прымітыўны) прыхільнікаў перамен. Напрыклад, незалежная прэса таксама ня выедзе на прымітыўных агітках. Трэба варушыць глуздамі, як ствараць моцны, крэатыўны прадукт, бо іначай праз нейкі час ўлада скажа: ну вось, вярнулі ў шапікі, а наклады амаль тыя самыя!

А пакуль што трэба змагацца за зьмякчэньне рамкавых умоваў.

Натуральна, апазыцыя ня ў стане скочыць вышэй за галаву.

Але вось-вось могуць пачацца тэктанічныя працэсы пад уплывам фінансава-эканамічнага форс-мажору.

На ўсе выпадкі мусіць быць плян А, плян Б. Каб ня чухалі патыліцу, калі раптам матэрыялізуецца сакральная Плошча: а куды ж весьці гэтыя тысячы?

Віктар Івашкевіч падаў на канфэрэнцыі яскравы прыклад. У 1991 годзе не было ўвогуле ніякіх выбараў. Але калі намэнклятура пасьля путчу апынулася ў прастрацыі, дык малалікая апазыцыя БНФ зрабіла ўсё (ну, добра, амаль усё), што хацела, бо была маналітнай, валявой ды мела выразную праграму.

# Намесьнік дырэктара НДІ эканомікі: Час патрабуе лібэральна-патэрналісцкай мадэлі

Мінэканомікі распрацавала праект Дзяржаўнай комплекснай праграмы мадэрнізацыі эканомікі.

Крызіс прадэманстраваў недастатковую эфэктыўнасьць чыста лібэральных мадэляў эканомікі ва ўмовах глябальнай рэцэсіі, мяркуе намесьнік дырэктара Навукова-дасьледчага эканамічнага інстытуту Мінэканомікі Віктар Пінігін. На ягоную думку, лібэральна-патэрналісцкія мадэлі эканамічнага ўладкаваньня робяцца ўсё больш папулярнымі. У Беларусі добра зарэкамэндавала сябе ў пераходны пэрыяд патэрналісцкая мадэль, якая засноўваецца на дастаткова жорсткім адміністрацыйным рэгуляваньні, кажа эканаміст.

Сёньня ж адміністрацыйная эканоміка свае рэсурсы вычарпала і насьпела патрэба мадэрнізацыі. Што сьведчыць пра гэта? Высокі ўзровень зносу асноўных сродкаў, нязначная доля прадукцыі, што выпрацоўваецца на аснове высокіх тэхналёгій, а таксама так званы перагрэў эканомікі. Ён выкліканы тым, што сукупны попыт у краіне перавышае сукупную прапанову. Попыт на тавары разагрэецца за кошт росту зарплаты, крэдытаў і замежнай запазычанасьці.

В.Пінігін акцэнтаваў увагу таксама на праблемах прадпрыемстваў, што выпускаюць канкурэнтаздольную прадукцыю. Іх магутнасьці загружаныя амаль на 100%, што стварае націск на вытворчасьць. Як, напрыклад, у будаўніцтве, магутнасьцяў якога ўжо недастаткова для асваеньня ўсіх наяўных капітальных укладаньняў.

Асноўная мэта мадэрнізацыі эканомікі — павышэньне канкурэнтаздольнасьці. Але мадэрнізацыя, лічыць эканаміст, — гэта ня толькі ўкараненьне адных новых тэхналёгій і абсталяваньня. Трэба рабіць акцэнт на мадэрнізацыі эканамічных інстытутаў і арганізацыйна-эканамічных мэханізмаў.

Праект праграмы прадугледжвае адыход ад рэгуляваньня цэнаў. Захаваецца яно толькі адносна абмежаванай колькасьці сацыяльна значных тавараў і на прадукцыю манапалістаў.

Мінэканомікі таксама абяцае ў чарговы раз паслабленьне ў падатковай сфэры. Прадугледжваецца адмова ад падтрымкі сельгасвытворцаў. Будзе перагледжаны парадак адлічэньняў у інавацыйныя фонды з прынцыповым зьмяненьнем крыніц іх выплаты, ды адбудзецца ўкараненьне сыстэмы электроннага падатковага дэклараваньня.

Малому і сярэдняму бізнэсу праект праграмы абяцае зьніжэньне адміністрацыйных бар'ераў і спрашчэньне працэдураў.

У галіне прыватызацыі чакаецца спрашчэньне працэдуры выдзяленьня зямельных участкаў ва ўласнасьць і арэнду, аптымізацыя долі дзяржавы ў акцыянэрным капітале прадпрыемстваў, утварэньне інстытуту давернага кіраваньня акцыямі.

Айчынныя прадпрыемствы не апынуцца ў руках намэнклятуры, упэўнены В.Пінігін, бо гэтага не прадугледжваюць прапановы па мадэрнізацыі эканомікі, сфармуляваныя ў праекце праграмы. Разам з тым, эканаміст нагадаў, што сёньня для Беларусі актуальнае пытаньне матывацыі вышэйшых кіраўнікоў. Яны, у выпадку пасьпяховага кіраваньня, змогуць атрымліваць сваю долю акцыяў прадпрыемства.

Знайшлося ў праекце мадэрнізацыі айчыннай эканомікі месца й ідэі стварэньня холдынгаў на базе дзяржаўных канцэрнаў. У якасьці прыкладу прыводзіцца ідэя стварэньня льнянога холдынгу. Больш не выклікае страху ва ўладаў магчымасьць уваходжаньня нашых прадпрыемстваў у замежныя транснацыянальныя карпарацыі.

**Сямён Печанко, паводле БЕЛТА**

# З Днём Герояў!

Зварот Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі да беларускага народу да Дня Герояў 27 лістапада.

Дарагія браты і сёстры!

Ад імя Рады Беларускай Народнай Рэспублікі вітаю Вас з угодкамі Слуцкага Збройнага Чыну!

Раблю гэта, аднак, сёньня з пэўным смуткам. Што сказалі б нашы слаўныя случчакі, калі б пабачылі, што 88 гадоў пасьля іхнага Збройнага Чыну, калі яны былі гатовыя памерці, каб жыў наш край — вольная і незалежная Беларуская Народная Рэспубліка, — мы ўсё яшчэ ў няволі.

Так, у няволі, дарагія Суродзічы. Дасюль мы ня зьдзейсьнілі ідэалаў, выказаных у Акце 25 Сакавіка! За выняткам беларускай моладзі, якую я вітаю ад глыбіні сэрца, людзі нашыя, наш народ, яшчэ ўсё жывуць у страху, яшчэ ўсё ня ведаюць сэнсу словаў свабода, воля, людзкая годнасьць. Абы выжыць да заўтра, абы ня страціць працу, абы ня страціць пэнсіі — вось ідэалы пераважнай бальшыні нашага народу 88 гадоў пасьля Слуцкага Збройнага Чыну.

А маглі б мы быць, як нашы вольныя суседзі, народам паўнавартасным, часткаю Эўрасаюзу, жыць заможна і годна, вырашаць свой лёс не ў залежнасьці ад волі дыктатара і ягоных паплечнікаў, а ў залежнасьці ад супольнага свабоднага выяўленьня волі — так як найлепш для ўсіх нас, — каб дзеці нашыя і ўнукі ганарыліся сваім краем, а не стараліся за ўсякую цану яго пакінуць з надзеяй, што знойдуць шчасьце на чужыне.

Але для таго, каб дамагчыся свабоды і дабрабыту, нам трэба памятаць нашых герояў, любіць Беларусь так, як яны яе любілі, і верыць, як гэта казаў новаабраны прэзыдэнт Злучаных Штатаў падчас свае выбарчай кампаніі: «Так, мы можам!» Ці ж мы горшыя за народы вольных краінаў сьвету? Мы ня горшыя, дарагія Суродзічы, але, магчыма, мы яшчэ не зразумелі, што будучыня нашая ў нашых руках. Што толькі мы можам зрэалізаваць высакародныя ідэалы нашых слаўных продкаў-случчакоў.

Жыве Беларусь!

**Івонка Сурвілла, Старшыня Рады БНР**

# У 44-га не страляць

Ці ходзіць па Плошчы Перамогі ў Менску новы Лі Гарві Освальд? Піша **Віталь Тарас**.

45 гадоў таму, 22 лістапада 1963 году ў Даласе, штат Тэхас, быў застрэлены трыццаць пяты прэзыдэнт ЗША Джон Фіцджэральд Кенэдзі. Абранаму сёлета прэзыдэнту Злучаных Штатаў Бараку Хусэйну Абаму ў той дзень споўнілася тры месяцы. Абаму й Кенэдзі параўноўвалі ў самых розных мэдыях ужо шмат разоў. Але цікавымі для параўнаньня ўяўляюцца ня толькі іхныя асобы. Абодва сталі сымбалямі сваёй эпохі.

## Харызма

У артыкуле «Барак Абама й новая амэрыканская мара» Рашэда Чаўдхуры, пераклад якога «Наша Ніва» надрукавала ў нумары за 6 лістапада, выказваецца апасеньне, што з Абамам можа здарыцца тое ж, што з Марцінам Лютэрам Кінгам (ён быў застрэлены расістам у 1968), Малькольмам Эксам і Джонам Кенэдзі. То бок, новаабранага 44-га прэзыдэнта ЗША могуць забіць. Альбо, піша аўтар, яго можа напаткаць лёс Джымі Картэра. Той ня змог зьдзейсьніць большасьці сваіх задумаў. Сымбалем ягонага няўдалага прэзыдэнцтва ў памяці выбарцаў засталося крушэньне гелікоптэра з амэрыканскімі дэсантнікамі, што павінны былі вызваліць закладнікаў у пасольстве ЗША ў Тэгеране, захопленай іранскімі маджахедамі.

Але ж і Джон Кенэдзі, які быў на чале Злучаных Штатаў усяго тры гады, не дамогся выдатных посьпехаў. На самым пачатку ягонага прэзыдэнцтва, у 1961, адбылася няўдалая спроба скінуць рэжым Фідэля Кастра на Кубе. Высадка вайсковага дэсанту ў Затоцы Сьвіньняў скончылася паразай. Дэсантнікі — а гэта былі кубінскія эмігранты, якія прайшлі спэцпадрыхтоўку ў ЦРУ — страцілі каля ста чалавек забітымі і звыш тысячы чалавек палоннымі. Пазьней іх усіх выкупіў прэзыдэнт Кенэдзі. Аднак кубінскія эмігранты не даравалі яму паразы. У ЦРУ таксама вінавацілі прэзыдэнта ў нерашучасьці падчас апэрацыі, тым самым здымаючы зь сябе адказнасьць за яе правал. У далейшым гэта стала падставай папулярнай вэрсіі забойства Кенэдзі, паводле якой яно сталася вынікам змовы. Але пра гэта гаворка пойдзе ніжэй.

У 1962 г. праз канфлікт з Кастра і паводзіны Хрушчова разгарэўся Карыбскі крызіс. Атамнай вайны з СССР Кенэдзі, на якога ціснулі «ястрабы» ў ягонай Адміністрацыі, удалося пазьбегнуць літаральна ў апошні момант перад катастрофай.

Менавіта пры Кенэдзі ў Паўднёвы Віетнам былі перакінутыя першыя вайсковыя падразьдзяленьні ЗША, якія пазьней уступілі ў вайну.

Унутры краіны падтрымка прэзыдэнтам барацьбітоў з расавай сэгрэгацыяй выклікала ярасную рэакцыю белага істэблішмэнту паўднёвых штатаў.

Кенэдзі падтрымаў касьмічную праграму палётаў на Месяц. Але гістарычны палёт «Апалёна-11», экіпаж якога першым высадзіўся на натуральным спадарожніку Зямлі, адбыўся толькі ў 1969-м.

І тым ня менш папулярнасьць Кенэдзі ў ЗША ды Эўропе была фэнамэнальнай. На чым палягала ягоная харызма? Можа, на тым, што ён першым з прэзыдэнтаў пачаў выступаць па тэлебачаньні ў жывым эфіры? На тым, што амэрыканцам і асабліва амэрыканкам імпанаваў ягоны імідж вайсковага лётчыка, які ўдзельнічаў у баявых апэрацыях на Ціхім Акіяне падчас Другой сусьветнай вайны? На ягонай знакамітай усьмешцы, манеры паводзінаў, добрым выхаваньні (ён быў каталіком, выхадцам з багатай сям'і ірляндзкага паходжаньня)? Мала хто ведаў тады, што ў адносна маладога прэзыдэнта цэлы букет хваробаў, што ён вымушаны прымаць гарманальныя прэпараты, ад якіх у яго быў зьлёгку азызлы твар. На публіцы разам з жонкай Жаклін і дзецьмі ён часта зьяўляўся ў басэйне альбо на тэнісным корце. Невядома было шырокай публіцы і пра ягоныя шматлікія раманы. У тым ліку — з Мэрылін Манро, якая сьпявала яму Happy Birthday на ягоным 45-годзьдзі ў Мэдысан Сквэр Гардэн.

## Мішэль

Джон Кенэдзі і Мэрылін Манро — гэта й было новае аблічча Амэрыкі, якое стане адным з найбольш устойлівых сымбаляў эпохі 1960-х і нават дажыве да нашых дзён. Хай сабе ў выглядзе міфу. Грамадзкія міфы, а не палітыкі, насамрэч, правяць сьветам.

Амэрыка — мабыць, упершыню ў ХХ стагодзьдзі — уразіла сьвет не сваімі гарматамі, авіяносцамі ці атамнымі падлодкамі. І нават ня Бруклінскім мастом альбо Эмпайр Стэйт Білдынгам. Мяккая ўсьмешка Мэрылін — шыкоўнай бляндынкі з пульхнымі вуснамі й крыху сумнымі вачыма, якая прыйшла ў кіно амаль што з вуліцы — зачаравалі ўсіх, у тым ліку і прэзыдэнта ЗША. На фоне Кенэдзі як пародыя сталі ўспрымацца словы пра Леніна як «самага чалавечнага чалавека». Сапраўды, новая эра, сымбалямі якой сталі Кенэдзі й Мэрылін, была эрай яшчэ не міласэрнасьці (пра гэта застаецца толькі марыць), але эрай чалавечнасьці.

Так, пасьля была даўгая вайна ў Віетнаме і яшчэ шмат войнаў… Але ўсяго праз два гады па сьмерці Джона ў ЗША прыедуць



**Лі Гарві Освальд. Фота зроблена ў Менску.**

на гастролі «Бітлз», чыя шалёная папулярнасьць у сьвеце стане прадвесьнем пацыфісцкіх настрояў у ЗША ды Эўропе, якія пахаваюць вайну. Можна сабе зь лёгкасьцю ўявіць, як Кенэдзі, дажыві ён да таго часу, прымае ліверпульскіх хлопцаў у Белым Доме. Нездарма муж і жонка Кенэдзі камунікавалі зь дзеячамі амэрыканскай поп-культуры, нездарма Джон стаўся героем опэры на Брадвэі, а потым і героем песенек. У «Ролінг Стоўнз» у песьні Sympathy for the Devil ёсьць такія радкі — I shouted out/Who killed the Kennedys?/When after all/It was you and me. («Я выкрыкнуў: хто забіў Кенэдзі? У рэшце рэшт, гэта былі ты і я» — **ВТ**)

Здараюцца дзіўныя перагуканьні ў часе. У 1965-м «Бітлз» запісалі песьню «Мішэль», якая атрымала нечуваную папулярнасьць у сьвеце. Жонку Барака Абамы таксама завуць Мішэль. Яе часта параўноўваюць з Жаклін Бувье, больш вядомай як Джэкі Кенэдзі. Яна пакінула след у гісторыі ня толькі як жонка прэзыдэнта ЗША, а потым жонка мільярдэра Анасіса, але як адна з найбольш папулярных жанчын свайго часу, заканадаўца модаў і сымбаль жаночай прыгажосьці.

Пра Мішэль Абаму пішуць ня толькі як пра добрую жонку й маці і пры гэтым — прывабную жанчыну, якая ўмее элегантна апранацца, але як чалавека адукаванага, здольнага й дасьціпнага, з уласнымі поглядамі й прынцыпамі.

У адным з старых галівудзкіх фільмаў белы паліцыянт казаў гераіні: «Ты чорная, але прыгожая». На што гераіня з годнасьцю пярэчыла: «Я чорная і прыгожая».

## JFK і ВНО

Кенэдзі быў папулярны пры жыцьці. Пасьля сьмерці ён стаў звышпапулярным. Само ягонае забойства зрабілася апокрыфам. Кароткі фільм, зьняты на аматарскую кінакамэру жыхаром Даласу Абрагамам Запрудэрам (ён нарадзіўся ў Ковелі ва Ўкраіне) у момант забойства Джона Кенэдзі, стаў, бадай, самым вывучаным кінадакумэнтам ХХ стагодзьдзя. Дастакова зайсьці на сайт youtube.com, каб пабачыць, што ўнікальныя кадры забойства, зьнятыя Запрудэрам, у розных відэаварыянтах, ужо ў наш час прагледзела больш за мільён наведнікаў.

Няма недахопу і ў рознага роду канспіралягічных тэорыях у сувязі з забойствам Кенэдзі. У 1991 годзе знакаміты рэжысёр Олівэр Стоўн выпусьціў фільм JFK (у постсавецкім пракаце ён называўся «Джон Ф. Кенэдзі. Стрэлы ў Даласе») — бадай, адзін з найменш удалых фільмаў у ягонай творчай біяграфіі, хоць стужка і прынесла немалы прыбытак. Фільм пабудаваны на вэрсіі былога акруговага пракурора Новага Арлеану Гарысана, паводле якой забойца Кенэдзі Лі Гарві Освальд быў толькі адным з выканаўцаў. У фільме робіцца высноў, што ў антыпрэзыдэнцкай змове ўдзельнічалі спэцслужбы, антыкастраўская апазыцыя і віцэ-прэзыдэнт ЗША Ліндан Джонсан, які стаў прэзыдэнтам пасьля Кенэдзі.

Такая ж вэрсія (за выключэньнем удзелу ў змове Джонсана) утрымліваецца ў многіх кнігах, якія выйшлі за апошні час — у прыватнасьці, у рамане амэрыканскага пісьменьніка Дона Дэліла «Шалі», якая выйшла ў 1988 г.

Кніга цікавая ня столькі сюжэтам, колькі яскравым псыхалягічным партрэтам Лі Освальда і дэталямі, узятымі зь ягоных дзёньнікаў і асабістай справы. Вось фрагмэнт «Гістарычнага дзёньніка» з разьдзелу кнігі, у якім распавядаецца пра жыцьцё Освальда ў Менску, дзе той працаваў на заводзе і дзе пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай Марынай Прусаковай. «Набліжэньне восені, мой жах перад першай расейскай зімой таюць у шыкоўным золаце і барве беларускай восені, сьліваў пэрсікаў і вішняў шмат, у гэтыя апошнія тыдні восені я здаровага карычневага колеру і нашпігаваны свежымі пладамі» (Пераклад з расейскага выданьня: Дон Дэліл. Шалі. Масква: «Эксмо», 2005; захавана пунктуацыя арыгіналу — **ВТ**). Далей ідзе такі фрагмэнт: «Шакаляд дарагі. У гэтых людзей заганная цяга да салодкага. У кандытарскай пастаянныя чэргі. Жыцьцё складаецца з дробязяў. Шакаляд, прайгравальнік, ежа з аўтамату». Апошнія словы — чыстая праўда. Освальду далі кватэру ў самым цэнтры Менску. А на пачатку 1960-х на плошчы Перамогі былі ўсталяваныя аўтаматы, у якіх прадаваліся бутэрброды з каўбасой. Праўда, яны неўзабаве зламаліся й кудысьці зьніклі. Але амэрыканец гэтага, відаць, ужо не засьпеў.

На старонках раману Освальд паўстае, хутчэй, няшчасным, узлаваным на ўвесь сьвет нэўрастэнікам, чым героем, якім, несумненна, хацеў быць. Ён быў марксістам (прачытаў некалькі кніжак Троцкага), леваком, але не ідэйныя матывы прымусілі яго ўзяць вінтоўку з аптычным прыцэлам у рукі. Характэрная псыхалягічная дэталь. Калі яго арыштавалі пасьля забойства Кенэдзі, Освальд узрадаваўся таму факту, што ў газэтах і на тэлебачаньні называлася ягонае поўнае імя — Лі Гарві Освальд. Так, як Джон Фіцджэральд Кенэдзі. Поўным імем Освальда не называлі раней ніколі ў ягоным жыцьці.

## Забіць прэзыдэнта...

Освальд распачаў галерэю падобных сабе пэрсанажаў ХХ стагодзьдзя — Марк Дэвід Чэпмэн, забойца Джона Ленана, Джон Гінклі (малодшы), які зрабіў замах на Рональда Рэйгана. Мэтай псыхічна хворага Гінклі было прыцягнуць да сябе ўвагу акторкі Джудзі Фостэр, якой ён напісаў мноства лістоў. Злачынца быў упэўнены, што калі заб'е прэзыдэнта, дык атрымае такі самы сацыяльны статус, што і галівудзкая кіназорка.

Часам здараецца, што людзі, апынуўшыся на пасадзе прэзыдэнта, адчуваюць тыя самыя комплексы, што і Гінклі. Такі чалавек, напрыклад, калі гаворыць пра Барака Абаму «спадзяюся, ён адукаваны чалавек», напэўна, адчувае сябе на сваім месцы. (Абама скончыў Калюмбійскі ўнівэрсытэт у спэцыяльнасьці «Міжнародныя адносіны» і Гарвардзкі інстытут юрыдычных навук, зьяўляецца аўтарам васьмі кніг.)

Многія, напэўна, зьвярнулі ўвагу на сюжэт «Эўраньюз» з Іраку, які выйшаў адразу пасьля перамогі Абамы на выбарах. Там амэрыканскія салдаты глядзяць па тэлевізары сюжэт пра падвядзеньне вынікаў выбараў на радзіме. Але перад гэтым у навінах яны бачаць рэпартаж з Расеі, дзе прэзыдэнт Мядзьведзеў выступае ў Думе з пасланьнем. Салдаты сьмяюцца зь яго, паказваюць пальцамі. Гэтую частку сюжэту пазьней выразалі. Сапраўды, нават пры вонкавым параўнаньні новаабранага прэзыдэнта Абамы і прэзыдэнта Мядзьведзева, узьнікае забаўнае ўражаньне. Маленькі, зашпілены на ўсе гузікі, зь нерухомымі мышцамі твару, з рачнымі вачыма чалавек пафасна, з жалезнымі інтанацыямі выступае ад імя вялікай дзяржавы, палохае іншую вялікую дзяржаву ракетамі, з усіх сілаў стараецца выглядаць велічным.

У Барака Абамы, канечне, праблемаў ня менш, а нават і больш, чымся ў многіх ягоных калегаў за акіянам. Ці здолее ён спраўдзіць спадзяваньні суайчыньнікаў, якія бачаць у ім асобу, роўнавялікую Кенэдзі, мы ня ведаем. Мы можам толькі спадзявацца, што новы прэзыдэнт сапраўды зь цягам часу ўвасобіць новую эпоху. Эпоху, у якой расістам, хамам, невукам і прайдзісьветам любога кшталту будзе мулка.

# «Чорны кот» на трэцім месцы

Кінафэстываль «Лістапад», які праходзіў з 15 па 22 лістапада, зь цяжкасьцю ўнікнуў скандалу. Зь першых дзён у лідэры глядацкіх сымпатый выбілася беларуская карціна «На сьпіне ў чорнага ката». Гэта кінакамэдыя Івана Паўлава з унучкаю Лукашэнкі Вікай у галоўнай ролі.

Менскі міжнародны кінафэстываль, які праходзіў у Менску з 15 па 22 лістапада ў пятнаццаты раз, традыцыйна прадстаўляе стужкі, якія атрымалі розгалас на міжнародных фэстах. Сёлета на экранах былі брытанская карціна «Кантроль», амэрыканскія «Пісьменьнікі свабоды», ізраільскі «Візыт аркестра», мэксыканскі шэдэўр Карласа Рэйгадаса «Маўклівае сьвятло», бальгарскі сацрэалістычны нуар «Дзіфт».

Хаця на кінафэсьце прадугледжаныя прафэсійныя прызы ад кінэматаграфістаў, галоўная ўзнагарода «Лістападу» і яго разынка — прыз глядацкіх сымпатый. Летась ён дастаўся нямецкай антытаталітарнай стужцы «Жыцьцё іншых».

На тле замежных фільмаў, беларускія стала выглядалі недарэчнасьцю — і ніколі не набіралі вялікай колькасьць балаў.

Але карціна Івана Паўлава пра чорнага ката, Нацыянальную бібліятэку й працьвітаючую краіну да апошняга дня фэсту была запісаная на першае месца з адзнакаю 9,15 з 10 магчымых. Галасаваньне праходзіла вельмі проста — на ўваходзе наведнікам давалі аркуш зь лічбамі, дзе глядач пазначаў бал за карціну — і на выхадзе аддаваў вынікі.

Галасаваньне за «Чорнага ката» выклікала вялікае зьдзіўленьне — хаця стужка магла проста прыцягнуць у залю чальцоў здымачнай групы дый іхных шматлікіх знаёмых. Затое фэстывальная публіка на сайце «Лістападу» выказвалася надзвычай рэзка. «Сорамна мусіць быць за такія стужкі і за такія ацэнкі!» «У найгоршых традыцыях «Беларусьфільму»...» «Я калі ўбачыла адзнаку, страціла мову. Шаноўныя кінааматары, а давайце любому фільму паставім усе па 10 балаў, каб перабіць гэты нікому не зразумелы посьпех «беларускага шэдэўру».

У апошні дзень паказаў наперад рэзка вырваліся румынская стужка «Мары пра Каліфорнію» і расейская «Пасажырка» Станіслава Гаварухіна. Яны й сталіся пераможцамі кінафэсту. Гран-пры дасталося карціне Станіслава Гаварухіна, срэбра — «Марам».

Абуральнік спакою «Чорны кот» абышоўся суцяшальнаю бронзаю.

Але стужка беларускага рэжысёра цалкам легальна — і без усялякіх накрутак — магла заняць першае месца глядацкіх сымпатый. На кінафэсьце ў Рызе, які таксама праходзіў у лістападзе, карціна беларускага аўтара абышла ўляўраваную «Пасажырку». І гэта была стужка «Розыгрыш» рэжысёра Андрэя Кудзіненкі, які напаўзабаронены ў Беларусі. На кінафэсьце «Лістапад» — «Розыгрышу» не было.

**Андрэй Расінскі**

## СЬЦІСЛА



### У навагоднюю ноч на АНТ пакажуць «Батлейку»

Сьвяточны тэлепраект падрыхтаваны паводле матываў твораў Кандрата Крапівы. Героі м'юзыклу размаўляюць і сьпяваюць па-беларуску.

Здымкі м'юзыклу «Батлейка-2009» адбываліся ў Мірскім замку **(на фота)**, а таксама ў вёсцы Сіняўская Слабада, што ў Карэліцкім раёне на Гарадзеншчыне. Галоўныя героі навагодняй казкі — княжна («Міс Беларусь» Вольга Хіжанкова) і «Батлейка» (артысты Дзяржаўнага ансамблю танцу). У праекце былі задзейнічаныя Іна Афанасьева, Ларыса Грыбалёва, Саша Нема, Аляксей Хлястоў, Люся Лушчык, гурты «Чук і Гек», «Цягні-піхай».

**Паводле perspektiva.grodno.by і esoligorsk.net**

### «J:морс» рыхтуе новы альбом

Гурт «J:морс» цяпер актыўна працуе над новым альбомам, рэліз якога мае адбыцца на пачатку 2009 г. Мастэрынг матэрыялу робіцца ў Кіеве ў Віталя Цялезіна, які працаваў з гуртамі «Океан Ельзи» і «Ляпіс Трубяцкой». Тым часам, у межах акцыі «Сэрца жыве» працягваюцца інтэрнэт-таргі, на якіх можна набыць акустычную гітару Ўладзімера Пугача. Менавіта на ёй за апошнія пяць гадоў ён напісаў большасьць гітоў «J:морс». Цана інструмэнту ўзьнялася з 200 да 315 даляраў. Сродкі пойдуць на апэрацыю па перасадцы сэрца для Мішы Ларына. Падрабязьней пра дабрачынную акцыю — на сайце serca.tut.by.

### Першы дзівідэюшны канцэртнік «Нэйра Дзюбеля»

У творчым аб'яднаньні «Осмас» выйшаў першы дзівідэюшны канцэртнік «Нэйра Дзюбеля».

Ва ўтульнай аздобе менскага клюбу «Графіці» Кульлінковіч вядзе нязмушаную гутарку з публікай. А ў перапынках — сьпявае разам з гуртам. Сьпявае і старыя песьні, праверана-эпахальныя: «Буду б...я тоска», «Переехало комбайном» і «Ехали уроды», і навейшыя баявікі: «Скрыпка дрыгвы», «Підарасы» і «Гузік». Добры гук, файная атмасфэра. Лідэр «дзюбялёў» кажа: «Балазе гэта быў канцэрт у невялічкім клюбе, бо на такіх імпрэзах, як публіка, так і гурт раскрываюцца болей, чым у вялікай залі, тут болей глямуру, пазытыву ды манікюру». Даведкі ды пытаньні: (029)-629-86-98 (Павал)

### Дні незалежнай Беларусі ў Пазнані

24—26 лістапада ў Познані, у межах дзён славянскай культуры, прайшлі дні Беларусі. Адкрылася выстава беларускіх мастакоў, прайшоў канцэрт «Народныя гукі Беларусі», адбылася літаратурная прэзэнтацыя. Удзельнікі: Юры Гумянюк, Віталь Воранаў, Уладзімер Блюднік, Давід Юнг. Мадэратар прэзэнтацыі: праф. Багуслаў Бакула.

### Майстры харавога бзумканьня

Беларускае трыё заняло шостае месца на дзіцячым конкурсе «Эўрабачаньне-2008», што прайшоў 22 лістапада ў Лімасоле (Кіпр). А перамаглі грузіны, якія пераўвасобіліся ў чмелікаў. Другое месца — ва Ўкраіны, трэцяе — у Літвы. Пераможца вызначыўся па выніках галасаваньня краін-удзельніц конкурсу — вынікі галасаваньня тэлегледачоў і журы складваліся суадносінах 50 на 50. Беларускія гледачы аддалі 12 балаў расейскаму канкурсанту.

### «Ляпісам» там ня месца

Беларускія Video Music Awards будуць уручаныя 14 сьнежня. Арганізатары першай прэміі музычнага відэа «Кліп-марафон-2008» разглядаюць сваю задуму як беларускі аналяг такіх фэстываляў, як Vimus у Партугаліі і MTV Video Music Awards. Ідэя паўстала ў 2007 годзе. Тады шэраг маладых людзей зладзілі невялічкі фэстываль і ўбачылі, што ўдзельнікам і гледачам гэтая ідэя спадабалася, таму вырашылі зрабіць першую музычную прэмію ўжо на вышэйшым узроўні. Сёлета будуць разглядацца толькі ролікі, зробленыя цягам 2007—2008 гадоў. Удзельнічаюць гурты «Нейра Дзюбель», «Крамбамбуля», Тarpach, «Палац», ZET, «Крама», IQ48, :В:N:, Mauzer. Першая штогадовая прэмія беларускага музычнага відэа «Кліп-марафон-2008» адбудзецца 14 сьнежня ў 18.00 у менскім клюбе «Акварыюм».

**Паводле ЛК, «Тузін гітоў», БелаПАН**

## КАЛЯНДАР



ЯЎГЕНІЯ ЯНІШЧЫЦ

### Гавары са мной па-беларуску

Будзе слоту абвяшчаць прагноз,
Лістабой учыніцьператруску.
Песьняй, што расчуліла да сьлёз
Я прыму цябе па-беларуску.

Краю бесслаўнага дачка,
Дзякуй лёсу, маю не ў нагрузку —
Зорны крыж Мацея Бурачка...
Ты ўва мне прызнаеш беларуску?

Сто разоў шукай другой красы,
А тым больш што сьвет даўно ня вузкі!
...Ды калі ты не бязродны сын —
Гавары са мной па-беларуску!

Час — вар'ят, шалёнае таксі.
Толькі ўсё ж ня мысьлю я аб спуску.
Кажаш, што магілы зарасьлі?
Памаўчы са мной па-беларуску.

20 лістапада споўнілася 60 гадоў з дня нараджэньня паэткі Яўгеніі Янішчыц (1948—1988). І 25 лістапада дваццаць гадоў — безь яе.


КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ

**Дэкор палацу Козелаў-Паклеўскіх у Красным Беразе.**

# Залатая жыла беларускага турызму

Калі ў Беларусі аднавіць хаця б палову з раскіданых па ўсёй тэрыторыі архітэктурных помнікаў, мы жылі б у іншай краіне. На жаль, прамінулыя 17 гадоў незалежнасьці былі бязьлітасна прамарнаваныя. І толькі цяпер, стаміўшыся ад бясконцых размоваў пра разьвіцьцё турызму, дзяржава сям-там узялася-такі за аднаўленьне гістарычна-культурнай спадчыны. У вандроўцы, наладжанай Беларускай асацыяцыяй журналістаў, старшыня рэспубліканскай рады ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» Антон Астаповіч пазнаёміў нас з маляведомым маршрутам па Магілёўшчыне, які мае ўсе шанцы стаць культавым.

### Сьвіслач

Вёска Сьвіслач, цэнтар сельсавету ў Асіповіцкім раёне, стаіць на маляўнічым месцы — злучэньні рэк Сьвіслач і Бярэзіна. Калісьці яна была сталіцай удзельнага княства на паўднёвай мяжы Полацкай зямлі. Больш за дзесяць гадоў таму зьявіўся дакумэнт, згодна зь якім тутака мусіў паўстаць Нацыянальны парк, але «воз и ныне там».

Больш за тое, калі зазірнуць у Дзяржаўны сьпіс гістарычна-культурных каштоўнасьцяў, вы знойдзеце там адно брацкую магілу часоў апошняй вайны ды будынак 1911 году, які належаў мясцоваму габрэю-гандляру і дзе месьцілася крамка з карчмой.

Абсурд, але галоўнай сьвіслацкай славутасьці — замчышча, культурны слой якога сягае ажно XIII стагодзьдзя, — у сьпісе гістарычна-культурных каштоўнасьцяў няма. Чаму? «Над сьпісам, які быў зацьверджаны ў 2007 г., у асноўным працавала мясцовае чынавенства. Каб было менш клопату, шмат якія аб’екты папросту ігнаравалі», — тлумачыць Антон Астаповіч, які сам паходзіць з Асіповіч.

Першапачаткова сьвіслацкі замак быў драўляны. У 1655 г., падчас жахлівай вайны Рэчы Паспалітай з Масквой, яго спалілі дашчэнту. Толькі ў XVIII ст. на ўзгорку пабудавалі некалькі арсэнальных памяшканьняў — цэйхгаўзаў, але далей справа ня рушыла. Руіны, у якіх прасочваецца традыцыйная беларуская мяшаная муроўка зь вінаградным арнамэнтам, захаваліся на замчышчы да нашага часу.

«У нас модна стала гаварыць пра разьвіцьцё турыстычнай інфраструктуры. Дык вось, летась нашае Таварыства некалькі разоў зьвярталася да Нацыянальнага агенцтва па турызьме з ініцыятывай правесьці для турфірмаў сумесны сэмінар па інтэрпрэтацыі гістарычна-культурнай спадчыны. Але насамрэч іх гэта не цікавіць!» — абураецца спадар Астаповіч.

Пакуль мясцовыя ўлады марудзяць, руіны сьвіслацкага замчышча гібеюць без аховы і кансэрвацыі. Колькі яны яшчэ вытрываюць, ня ведае ніхто.

### Жылічы

Мала хто ведае, што ў вёсцы Жылічы Кіраўскага раёну Магілёўскай вобласьці месьціцца ці не найвялікшы ў Беларусі шляхецкі двор — палац Булгакаў — помнік эпохі клясыцызму першай траціны XIX ст.

У добрым стане захаваліся парадныя памяшканьні.

Антычная ляпніна, дэкаратыўныя элемэнты, каміны суседнічаюць з савецкімі вітражамі і карцінамі ў стылі сацрэалізму.

Сёньня палац Булгакаў (разам зь Нясьвіскім і Мірскім замкамі, Краснабярэскім палацам, Каложай, Берасьцейскай і Бабруйскай крэпасьцямі і інш.) уваходзіць у сьпіс 10 нерухомых гістарычна-культурных каштоўнасьцяў для прыярытэтнага фінансаваньня зь дзяржбюджэту. І адзначаны ён 1-й катэгорыяй каштоўнасьці.

Як апавяла навуковы супрацоўнік музэю Ірына Шляхтава, летась на распрацоўку праектна-каштарыснай дакумэнтацыі па рэстаўрацыі заходняй часткі палацу было выдзелена 360 млн рублёў. Сёлета там павінныя пачацца рэстаўрацыйныя работы коштам больш за 1 млрд рублёў.

Да 2010 году ў Жыліцкім палацавым комплексе плянуецца цалкам аднавіць шляхецкую сядзібу XIX стагодзьдзя. Але паводле інфармацыі, якую Антон Астаповіч атрымаў ад навуковага кіраўніка праекту — дырэктара Цэнтру па рэгенэрацыі гістарычна-культурных ляндшафтаў і тэрыторый Аляксандра Кропатава, фінансаваньне можа быць паменшанае, а тэрміны здачы аб’екту аднесеныя на 4—5 гадоў.

### Бабруйск

Яшчэ адзін аб’ект з ТОП-10 нерухомых гістарычна-культурных каштоўнасьцяў Беларусі — Бабруйская фартэцыя (крэпасьць), пабудаваная на месцы старажытнага гораду на пачатку XIX ст. Яе стан выклікае найбольшы непакой адмыслоўцаў.

Характэрна, што самы цяжкі ўдар фартэцыя перанесла не падчас сусьветных войнаў, а ў 1950—1960-я гады. Тады саветы зьнішчылі ўсе вонкавыя фартыфікацыйныя пабудовы, валы, бастыёны. Сёньня застаўся толькі 8-ы палігон уздоўж Бярэзіны, рэшткі ўмацаваньня «Фрыдрых Вільгельм», форт Апэрмана і шэраг казармаў.

«Самае страшнае,— апавядае Антон Астаповіч, — што ў мясцовых уладаў няма агульнай канцэпцыі адносна гістарычна-культурнай каштоўнасьці 2-й катэгорыі. Аб’екты Бабруйскай крэпасьці распрадаюцца нават без аўкцыёну і за гэтымі супрацьзаконнымі дзеяньнямі няма аніякага кантролю. Напрыклад, летась я размаўляў з прадпрымальнікам, які выкупіў у гарвыканкаму казарму за 50 тыс. рублёў!»

Дадамо, што ўлетку на тэрыторыі крэпасьці быў адчынены найвялікшы ў Беларусі ўльтрасучасны лядовы палац, што, па словах экспэртаў, таксама ёсьць парушэньнем гістарычна-культурнага заканадаўства.

### Красны Бераг

Краснабярэскі палац канца XIX ст. Козел-Паклеўскіх (2-я катэгорыя каштоўнасьці) — прыклад рамантычнай архітэктуры, якая спалучае неараманскае абліччa — так званае «цаглянае» дойлідства і комплекс інтэр’ернай аздобы пакояў і залаў палацу — у стылях антычным, гатычным, «альгамбра», маньерызму, барока і г.д.

Цягам дзесяцігодзьдзяў тут месьціліся навучальныя карпусы сельгастэхнікуму. У 1993-м пачалася рэстаўрацыя, але праз спарадычнае фінансаваньне будыніна пачала развальвацца на вачах. Палац уратаваў цуд. Кажуць, аднойчы ў 2003 годзе тагачасны старшыня Камітэту дзяржкантролю Анатоль Тозік вырашыў паказаць жонцы мясьціны юнацтва. Убачаны занядпад так абурыў чыноўніка, што ён надаў справе новы імпульс.

> Палац уратаваўся цудам. Побач праяжджаў Анатоль Тозік.

Цяпер, па словах Антона Астаповіча, рэстаўрацыя Краснабярэскага палацу ў мэтадалягічным пляне — адна з найменш праблемных у краіне. Як і ў Жылічах, падрадчыкам па рэстаўрацыі ўнікальных унутраных інтэр’ераў выступае ЗАТ НВА «Эльвіра», дзе сабраныя найлепшыя рэстаўрацыйныя кадры краіны.

Рэстаўратары спрабуюць адпавядаць міжнародным мэтодыкам, але ўдаецца гэта далёка не заўсёды. Гэтак, замяж драўляных аконных праёмаў паставілі пластыкавыя шклопакеты.

Перад тым як будаваць палац, тут заснавалі сваю цагельню, але з прычыны, што ўласных традыцыяў вытворчасьці не было, цэгла выходзіла вельмі нізкай якасьці. Праўда, сёньня ёсьць нямецкая тэхналёгія, якая дазваляе ўмацоўваць гэтыя восыпы.

Гісторык архітэктуры Натальля Пятровіч, якая рыхтавала навуковую даведку Краснабярэскага палацу, перакананая, што ён мусіць быць занесены ў сьпіс ЮНЭСКА.

Падсумоўваючы, расклад з гістарычнымі пабудовамі ў Беларусі даволі просты: калі прымаецца пастанова аб наданьні сядзібе ці палацу катэгорыі каштоўнасьці (пажадана 1-й), — усё будзе добра, будуць вылучацца сродкі і пабудову будуць рэстаўраваць. Помнік застанецца па-за ўвагай дзяржавы — яго чакаюць заняпад і паступовае разбурэньне.

Антон Астаповіч і ягоныя нешматлікія паплечнікі з Таварыства аховы помнікаў змагаюцца за захаваньне нашай агульнай спадчыны па ўсёй краіне. «Я цудоўна разумею, што цяпер кардынальным чынам мы нічога зьмяніць ня можам, — кажа ён. — У Дзяржаўны сьпіс гістарычна-культурных каштоўнасьцяў уключана больш за 4700 помнікаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры. Але праблема ў тым, што ў Беларусі хранічна парушаецца заканадаўства па ахове помнікаў. Таму нам застаецца зьбіраць дакумэнты для будучых пакаленьняў. Бо я веру, што абавязкова прыйдзе час, і ўсяму будзе дадзеная прававаяя ацэнка».

**Павал Касьцюкевіч, здымкі Кастуся Лашкевіча**


КАСТУСЬ ЛАШКЕВІЧ

**Крушні сьвіслацкага замку.**

# Як людзі выкручваліся
## зь фінансавага крызісу ў XVII ст.



Ці была інфляцыя ў ВКЛ? Ці існавалі сярэднявечныя абменьнікі? На гэтыя пытаньні адказвае **Аляксандар Крываручка**, адзін з аўтараў кнігі «Калекцыйная спадчына Вялікага Княства».

**«НН»: Ці былі ў ВКЛ абменьнікі?**

**АК:** У Эўропе сярэдніх вякоў ня было такога, што, калі падарожнік едзе ў іншую краіну, дык яму трэба запасьціся валютай. Усе эўрапейскія манэты, і ў тым ліку ВКЛаўскія, былі срэбраныя са стандартнай вагой, і таму з нашым паўгрошам можна было разьлічвацца, скажам, у Італіі. Хаця ў вялікіх гарадах Вялікага Княства ільга было без праблемаў памяняць грошы іншай краіны. Гэтая справа была аддадзеная на водкуп габрэям, і яны мянялі грошы, беручы сабе 4—5 працэнтаў.

Мала таго, нашыя манэты былі папулярныя ў Эўропе. Гэта адбывалася зь некалькіх прычынаў: чыста эстэтычна манэты ВКЛ былі прыгожыя, і апроч таго мелі высокую пробу срэбра. Пра папулярнасьць нашых грошай сьведчыць, што ў той жа Эўропе іх падраблялі вельмі актыўна. А чатырохграшовік Жыгімонта Аўгуста нават меў у Нямеччыне сваю мянушку, якую зь нямецкай можна перакласьці як «барадач».

**«НН»: Ці была ў ВКЛ інфляцыя?**

**АК:** Так. Сярэдзіна XVII стагодзьдзя, час вайны з Расеяй, быў пэрыядам самай жахлівай інфляцыі за ўсю гісторыю ВКЛ. Эталён — талер, стаў каштаваць не 600 салідаў, а 1500. Зьяўляюцца манэты наміналам 30 грошай, якія адпавядалі колішнім 12 грошам. «Цану мэталу не параўнаеш з Дабром для Айчыны», — было выбіта на іх. Гэтак тагачасныя ўлады намагаліся падсаладзіць суайчыньнікам горыч інфляцыі. Інфляцыя прывяла да паніжэньня якасьці саміх манэтаў. Тады грошы пачалі чаканіць і жук і жаба, ледзьве не ў кожнай вёсцы... Здаецца, іх рабіў кожны, хто мог расплавіць медзь і меў агульныя ўяўленьні пра зьнешнасьць караля і выгляд «Пагоні». Але ж чаканілі таксама тыя, хто ня вельмі каб тое ўяўляў: на тагачасных манэтах такія маляўнічыя партрэты Яна Казіміра і такія вершнікі мудрагелістыя, што дагэтуль гісторыкі за галаву хапаюцца. На мове археолягаў манэту сярэдзіны XVII стагодзьдзя называюць «царыцай палёў», бо няма такога поля ў сучаснай Беларусі, дзе б не знайшлося некалькі асобнікаў.



ЯРАСЛАЎ СЬЦЕШЫК

> «Цану мэталу не параўнаеш з Дабром для Айчыны», — было выбіта на абясцэненых грошах. Гэтак улада намагаліся падсаладзіць суайчыньнікам горыч інфляцыі.

**«НН»: Як вядома, на беларускіх сярэднявечных манэтах часьцяком зьвесткі пра год выданьня пададзеныя няслушна, або не пададзеныя ўвогуле. Як жа нумізматы высьвятляюць дакладны год выпуску манэты?**

**АК:** Па форме «Пагоні» напрыклад, паводле пастаў вершніка. Ці па форме кароны ў арла, па колькасьці пер'яў. Розныя спосабы. Нумізматы залазяць у такі гушчар, што аж жах! Але часам даходзіць да сьмешнага. Аднойчы, прыгледзеўшыся да адной з манэтаў XVI ст., я прыйшоў да жартаўлівай высновы, што вершнік не на кані, а на кабыле. І зноў жа жартам паведаміў пра тое «адкрыцьцё» нумізматычнай грамадзе. Тлумачыў я гэта проста — у тыя часы ў ВКЛ сапраўды былі розныя лобі: адны хацелі, каб у войску былі кабылы, а іншыя — каб коні, і гэтае супрацьстаяньне, так тлумачыў я, адбілася на тагачасных манэтах. Я хацеў адно пажартаваць, зусім не жадаючы, каб аматары старасьвеччыны з лупамі палезьлі і пачалі старанна аглядаць абрыс «Пагоні», але гэта ўсё ж адбылося. Я пачаў атрымліваць шматлікія тэлефанаваньні кшталту: «Так, Аляксандар Вы маеце рацыю! Вось і на манэтах 1652 году мы пагледзелі — таксама кабыла, а ня конь».

**«НН»: Колькі старажытных манэтаў трапляе на цяперашні рынак ад чорных капальнікаў?**

**АК:** Пэўна, адсоткаў сто. Рэч у тым, што калі шукае дзяржава, археалягічныя экспэдыцыі і г.д., зразумелая рэч — знаходкі ў продаж не паступаюць. Дапусьціць, што ў нейкай бабулі дагэтуль захоўваецца скарб сярэбраных манэтаў, таксама не выпадае. Усе хатнія скарбы збольшага знойдзеныя. Таму бальшыня новых-старых манэтаў, што трапляюць на рынак — гэта плён працы чорных капальнікаў.

**«НН»: Дык, такім чынам усіх нумізматаў можна прыраўнаць да скупшчыкаў скрадзенага?**

**АК:** У нашай краіне гэтае пытаньне юрыдычна неадрэгуляванае. Хаця існуе клюб нумізматаў, сябрам якога дазваляецца на год некалькі продажаў дублікатаў са свайго збору. І ці зьяўляецца гэта дублікатам часта таксама невядома. Але як вядома, сам у няволі, калі даў душы волі. Зьбіраць хочацца, і таму калекцыянэры часта не пытаюцца ў прадаўцоў, ці гэтая манэта атрыманая законным шляхам ці праз чорнага капальніка. Дый, на маю думку, нічога страшнага ў гэтых зьбіраньнях няма — даволі бяскрыўднае хобі.

**Гутарылі Павал Касьцюкевіч і Яраслаў Сьцешык**






> Грошы пачалі чаканіць і жук і жаба... Здаецца, іх рабіў кожны, хто мог расплавіць медзь і меў уяўленьне пра зьнешнасьць караля і выгляд «Пагоні».

**КАЛЯНДАР**

# Сьнежань

**1** — Дзень барацьбы са СНІДам.

**3** — Дзень бульбы. 3 сьнежня 1586 г. яна была ўпершыню прывезеная ў Эўропу (у Ангельшчыну) з Амэрыкі.

**9** — Дзень народзінаў Максіма Багдановіча (1891).

**10** — Дзень правоў чалавека.

**17** — Дзень беларускага кіно.

**22** — Пачатак Ханукі ў юдэяў. Сьвята працягнецца восем дзён. Адзначаецца ў памяць вызваленьня Ерусаліму ад элінаў і паўторнага асьвячэньня Ерусалімскага храму.

**25** — Божае Нараджэньне ў каталікоў, уніятаў, пратэстантаў.

**27** — 375 гадоў таму (1633) памёр Мялеці Смятрыцкі, царкоўны, грамадзка-палітычны дзяяч, пісьменьнік-палеміст (пахаваны ў сяле Дзермань, цяпер Ровеншчына, Украіна).

# Бог захацеў, каб мы былі беларусамі

«Мы ня лепшыя і ня горшыя за іншыя народы — у нас свая місія». Слова **айца Аляксандра Надсана**.



Юлія Дарашкевіч

Дарагія мае. Я вельмі дзякую Богу, што я магу быць разам з вамі. Я вельмі ўдзячны Богу, што я мог сустрэць мой юбілей сьвятарскі тут, на Бацькаўшчыне. Для мяне гэта вельмі дарагое.

Я ў першую чаргу сьвятар. І што такое сьвятар? Сьвятар мае быць пераймальнікам і пасьлядоўнікам свайго, так сказаць, кіраўніка галоўнага: Госпада нашага Ісуса Хрыста. Ісус Хрыстос прыйшоў на зямлю і сказаў: «Я ня прыйшоў, каб мне служылі, а каб паслужыць і даць жыцьцё вечнае для многіх». Гэта вельмі важная рэч — што сам Госпад Бог, стаўшыся чалавекам, прыйшоў ня як які вялікі ўладар, каб кіраваць, а прыйшоў, каб паслужыць, каб даць нам вечнае шчасьце. І безумоўна, за гэта, стаўшы чалавекам, ён і пацярпеў. Пасьля яго засталіся апосталы, іхныя наступнікі біскупы і сьвятары. Яны павінны жыць тым самым духам — ня каб ім служылі, але каб служыць, перадусім духоўна, весьці, дапамагаць людзям ісьці да Бога. Бо нашая апошняя мэта ёсьць жыцьцё з Богам, жыцьцё вечнае, якое мы маем дзякуючы Госпаду нашаму Ісусу Хрысту, які стаўся адным з нас, каб нам, людзям, даць магчымасьць быць дзецьмі Божымі. Вось гэта самае важнае.

Безумоўна, усе мы людзі. І для сьвятара ўсе людзі аднолькава дарагія і аднолькава блізкія. Ён дзе б ні быў, што б ні рабіў, мусіць усім дапамагаць ісьці да гэтай мэты, да Бога. Але, будучы чалавекам, ён мае сваю Бацькаўшчыну на зямлі. Яна яму дарагая асабліва, як кожнаму з нас. Ён хацеў бы таксама шчасьця сваім родным, усім сваім земляком, якія гавораць той самай мовай, якія маюць тыя самыя традыцыі, маюць тую самую мэнтальнасьць. Безумоўна, яны для яго бліжэйшыя. Гэта ягоная, так сказаць, пашыраная сям'я. Гэта зразумелая рэч.

Памятайма таксама, што сам Госпад Ісус Хрыстос вельмі сумаваў, яму нават сэрца балела за лёс сваёй зямной радзімы, радзімы Ізраілю, бо ён ведаў, што мае хутка спаткаць. Памятайма таксама і вялікага апостала Паўла, які быў апосталам для ўсіх народаў, сам будучы габрэем, але тым ня менш таксама моцна любіў свой народ і казаў, што яму сэрца баліць, што ён нават адрокся б ад Хрыста, каб ведаў, што гэта карысна для свайго народу. Безумоўна, адрачэньне ад Хрыста не прынесла б карысьці для ягонага народу, ён не адрокся. Але падумайце: якая ў яго любоў да свайго народу, да сваіх людзей, да зямлі, адкуль ён выйшаў. У нас, у беларусаў, таксама ёсьць свае прыгожыя прыклады. Нехта тут ужо ўспамінаў Скарыну. Наша бібліятэка ў Лёндане мае імя Францішка Скарыны. Пачытайма ягоныя прадмовы. Ён хацеў даць свайму народу слова Божае ў зразумелай мове, каб яны маглі сапраўды духова расьці і ісьці да Бога. Ён напісаў ясна. Дзеля чаго ён выдаваў свае кнігі? «Богу ў Тройцы адзінаму на славу, у чэсьць Найсьвяцейшай Маці Божай Дзевы Марыі і для дабра і пажытку свайго народу — як ён напісаў прыгожа ў сваей прадмове, — таму што з гэтага языка Бог мяне на сьвет пусьціў». Як гэта прыгожа сказана! Што сапраўды слова Божае ўнівэрсальнае для людзей, для свайго народу, бо ён таксама паходзіць ад гэтага народу. Вось для нас прыклад служэньня свайму народу і любові да свайго народу. Каб зрабіць усё магчымае для яго духоўнага збаўленьня і ўзросту.

Бог захацеў, каб мы былі беларусамі, значыцца меў для нас нейкую мэту. Мы ня ёсьць ні лепшыя, ні горшыя за іншыя народы. Але маем сваё месца. І павінны шанаваць і любіць, бо гэта таксама дар Божы. Відаць, Бог хоча, каб і на нашай мове разьлягаўся голас на Ягоную славу. Памятайма гэта. Шануйма іншыя народы, іншыя мовы, іншыя культуры, але таксама не забываймася пра нашае і будзьма ўдзячныя за тое, кім нас Бог стварыў.

Я, ведаеце, жыву далёка ад Беларусі. Фактычна большасьць майго жыцьця прайшла далёка ад Беларусі. Але заўсёды, усё маё жыцьцё, я меў Беларусь у сэрцы. Гэта вельмі важна. Дзе б ні быў, я не забываўся пра гэта. Мы жылі ў розных краях, і таму стварылі сваю малую Беларусь. У Англіі, калі там жыў ня толькі я, але і мае папярэднікі, людзі далёка лепшыя за мяне — сьвятой памяці біскуп Сіповіч, айцец Гарошка, айцец Журня, айцец Баговіч, паэт Вінцук Адважны — я меў гонар зь імі жыць і бачыць перадусім, якія гэта былі ўзорныя сьвятары, а таксама як яны любілі свой народ, жывучы практычна ўсё сваё жыцьцё далёка ад Бацькаўшчыны.

Яны для мяне былі настаўнікамі і прыкладамі. Я іх заўсёды памятаю. Бог іх паклікаў раней за мяне, я крышку, праўда, з гэтага незадаволены і наракаю і потым ім скажу, калі там сустрэнемся, што так нельга было мяне тут аднаго пакідаць. Апошнія амаль трыццаць гадоў мне прыйшлося весьці нашу беларускую справу, нашу місію, практычна самому. Цяпер ужо маю маладшага памочніка, і дзякуй Богу. Так што Бог дае ўсё ў сваім часе. Я хутка выяжджаю зноў зь Беларусі, бо мяне чакае праца ў Лёндане, але я выяжджаю з радаснымі пачуцьцямі сэрца, што Беларусь усё ж такі пры ўсіх цяжкасьцях жыве. Цяжкасьці будуць. Жыцьцё ніколі ня ёсьць бязь цяжкасьцяў. Але ад нас залежыць — цяжкасьці могуць або зламаць, або зрабіць мацнейшымі. І хай жа Бог дорыць усім нам ласку, каб гэтыя цяжкасьці, якія мы перажываем, умацавалі нас і каб вы ніколі ня страцілі надзею на лепшую будучыню для нашага народу.

## Дні Надсана

На тыдні Менск наведаў апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў замежжа Аляксандар Надсан. Ён прыяжджаў на радзіму сьвяткаваць 50-годзьдзе свайго сьвятарскага пасьвячэньня. Якое, 23 лістапада, супала з 102-й гадавінай «Нашай Нівы».

Чатыры беларускія дні 80-гадовага айца былі расьпісаныя па хвілінах. Візыты, спатканьні, размовы. Ён знайшоў час сустрэцца з усімі, хто хацеў яго бачыць. Завітаць у Рэдакцыю «Нашай Нівы». Адведаць у санаторыі ў Аксакаўшчыне Ўладзімера Арлова.

Афіцыйна айца Надсана прымалі ў Акадэміі Навук. Яго зямляк, Міхаіл Мясьніковіч, гаварыў да сьвятара па-беларуску.

23 лістапада Аляксандар Надсан правіў у Чырвоным касьцёле ўрачыстую літургію. У панядзелак тамсама прайшло грамадзкае віншаваньне сьвятара. Людзі ня тоўпіліся ў Дольную залю касьцёлу, стаялі ў праходах. Айца Аляксандра віталі Адам Мальдзіс, Генадзь Бураўкін, навукоўцы, сьвятары грамадзкія і культурныя дзеячы, сьпявала Кася Камоцкая, гучаў «Полацкі сшытак» і народная музыка. Завяршаючы вечарыну, Аляксандар Надсан зьвярнуўся да прысутных. На гэтай старонцы —прапануем Вашай увазе ягонае слова.

Зь Менску айцец скіраваўся ў Вільню, у Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт. Рашэньнем Сэнату ЭГУ Надсану нададзена ганаровая ступень Doctor Honoris Causa. Так высока Сэнат ацаніў навуковыя дасьледаваньні айца Аляксандра ў галіне гісторыі Беларусі і гісторыі хрысьціянства, а таксама ягоны ўнёсак у развіцьцё беларускай культуры і пашырэньне ведаў пра Беларусь у сьвеце.

Цырымонія ўганараваньня адбылася 27 лістапада.

**СМ**

# Ляван Буадзэ: Калі ёсьць вайна — аб’ектыўнасьці чакаць не прыходзіцца

З намесьнікам кіраўніка офісу Праграмы разьвіцьця ААН у Беларусі гутарыць Наталка Бабіна.

Ляван Буадзэ цудоўна гаворыць па-беларуску: правільна, выразна, прыгожа, толькі зь невялікім грузінскім акцэнтам, які дадае ягонай мове прываблівасьці... Таму, перш чым распытаць пра тыя глябальныя задачы, якія ён вырашае, я не магла не пацікавіцца, як мой суразмоўнік так дасканала вывучыў беларускую...

**Ляван Буадзэ:** Для мяне стала традыцыяй вывучаць мову краіны, у якой я працаваў. Так я вывучыў францускую, троху ўзбэцкую мову. Са славацкай было лягчэй, бо ў Славакіі ўсе на ёй размаўляюць... У Беларусі, на жаль, беларускую мову можна пачуць рэдка. І гэтая дыскрымінаванасьць, якая выразна заўважная — не хачу верыць, што гэта спэцыяльная палітыка, — але менавіта яна падштурхнула мяне да вывучэньня беларускай. Для мяне гэта было выражэньнем маёй пазыцыі: нацыянальная мова вельмі важная, і я, небеларус, інвэстую ў гэта свой час, каб падкрэсьліць значнасьць мовы і культуры для незалежнай дзяржавы. З сваімі супрацоўнікамі мы вырашылі, што будзем у офісе гаварыць па-беларуску — і вось ужо каля году стараемся трымацца свайго рашэньня.

У мяне была настаўніца, спадарыня Марына Абрагімовіч, я шчыра ёй удзячны за дапамогу.

**НБ: Чым Вы займаецеся ў прадстаўніцтве Арганізацыі аб’яднаных нацыяў? І як увогуле ацэньваеце эфэктыўнасьць дзейнасьці ААН у сёньняшнім сьвеце?**

**ЛБ:** Паколькі ААН — вельмі вялікая, разгалінаваная арганізацыя, то натуральна, што пытаньне пра эфэктыўнасьць яе працы час ад часу ўзьнікае. Я працую канкрэтна ў Праграме разьвіцьця ААН (ПРААН). Гэта самае вялікае агенцтва ў сыстэме ААН. Праблема ААН, як і іншых міжнародных арганізацый, у тым, што краіны-ўдзельніцы — а іх 192 — маюць розныя інтарэсы.

Прыярытэты ПРААН фармiруюцца глябальнымі праблемамі чалавецтва: жабрацтва, голад, экалёгія, даступнасьць адукацыі, праблемы СНІДу — вось кола таго, чым мы займаемся.

Цяпер мы скіроўваем сваю работу на дасягненьне «Мэтаў тысячагодзьдзя». «Мэты тысячагодзьдзя» — гэта дакумэнт, які ставіць вельмі канкрэтныя задачы, дае індыкатары, якіх трэба дасягнуць да 2015 г.: напрыклад, удвая скараціць колькасьць людзей, якія жывуць за рысай жабрацтва, і яшчэ 50 такіх індыкатараў, якія павінны палепшыцца.

**НБ: А якія задачы вырашае ПРААН у Беларусі?**

**ЛБ:** Беларусь досыць разьвітая краіна, і тут наша дапамога больш не фінансавая, а кансультацыйная, тэхнічная. Тут ёсьць праблемы, зьвязаныя з наступствамі аварыі на ЧАЭС, экалягічныя праблемы, праблемы СНІДу, рэгіянальнага разьвіцьця. Ва ўсіх гэтых галінах мы досыць добра супрацоўнічаем з уладамі. Акрамя нашай праграмы ў Беларусі працуюць іншыя агенцтвы ААН: ЮНІСЭФ, Упраўленьне Вярхоўнага Камісара ААН у справах бежанцаў, Сусьветная арганізацыя аховы здароўя, Група Сусьветнага банку.

Індэкс узроўню чалавечага разьвіцьця ў Беларусі досыць высокі — яна на 64-м месцы ў агульным сьпісе, першая сярод краін СНД (Расея на 67-м месцы).

Мне падаецца, мы зрабілі вялікую работу супраць распаўсюджваньня СНІДу. На шчасьце, СНІД для Беларусі — ня вельмі вялікая праблема, не катастрофа. Але дзякуючы нашым прэвэнтыўным мерам, спадзяюся, не захварэла шмат людзей. Таксама падаецца важным, што дзякуючы прэпаратам, якія мы закупляем, тыя людзі, што цяпер хварэюць, могуць жыць доўга і паўнавартасным жыцьцём.

Мне падаюцца важнымі праекты, зьвязаныя з экалёгіяй. Напрыклад, з забалочваньнем раней асушаных тэрыторый. Гэта ж вельмі важна. Калі Бог стварыў балота, значыць яно патрэбна. Беларускія балоты патрэбныя для захаваньня экалягічнага балянсу. ПРААН выдзяляе сродкі, каб вярнуць самыя вялікія зь іх у экасыстэму.

Адзін з галоўных напрамкаў нашай дзейнасьці — укараненьне тэхналёгій, якія спрыяюць паменшэньню колькасьці выкідаў вуглякіслага газу і паменшэньня парніковага эфэкту. Агулам кажучы, мы працуем, каб якасьць жыцьця людзей стала лепшай.

**НБ: Мне здаецца, што чалавецтва цяпер ужо назьбірала досыць рэсурсаў, каб пазбыцца голаду, беднасьці. Дык што перашкаджае гэтаму? Нейкае глябальнае зло? Ці прырода чалавека такая, што яго не хваляюць праблемы іншых людзей? Чаму дасюль ёсьць столькі бедаў, крызісаў?**

**ЛБ:** Я таксама згодзен, што грошай, рэсурсаў ужо дастаткова. Філязофія разуменьня, што няма чужой бяды, якраз і ляжыць у аснове дзейнасьці ААН. Усе краіны ААН падпісалі дэклярацыі пра тое, што глябальныя праблемы — эканамічныя, экалягічныя — трэба вырашаць глябальна. Аднак не заўсёды ёсьць жаданьне высокаразьвітых краін аддаваць свае рэсурсы на гэтыя мэты.

Вось цяпер ідзе фінансавы крызіс, вельмі сур’ёзны, магчыма, самы сур’ёзны пасьля Вялікай дэпрэсіі. Улады ў розных краінах укладаюць агромністыя сродкі, каб падтрымаць эканоміку. Напрыклад, ЗША ўжо ўклалі сотні мільярдаў даляраў у гэта. Калі стала неабходна, то ўлады знаходзяць такія грошы. Але калі ідзецца пра праблемы іншых краін, складана атрымаць нават невялікі адсотак ад гэтых сумаў. Таму вельмі важна, каб разьвівалася разуменьне таго, што на Зямлі ўсё ўзаемазьвязана, і праблемы ў нас агульныя. Голад у Афрыцы — гэта праблема для Эўропы і Амэрыкі.

І трэба зазначыць, што такое разуменьне ёсьць і расьце. Скандынаўскія краіны даюць на мэты ААН 1% ад ВУП. Гэта дастаткова многа.

І яшчэ адзін вельмі сур’ёзны фактар: ці могуць слабаразьвітыя краіны вырашыць свае праблемы, нават калі высокаразьвітыя краіны дадуць грошы? Вельмі часта гэта немагчыма. Калі ня мець адпаведных структур, адпаведных мэханізмаў, выдзеленыя грошы проста растануць, уцякуць у пясок... Таму важна яшчэ і дабіцца, каб выдзеленыя грошы ішлі на адпаведныя мэты.

**НБ: Дык Вы аптыміст ці пэсыміст? Чалавецтва справіцца з сваімі праблемамі?**

**ЛБ:** Аптыміст адназначна. Чалавецтва зрабіла бязьмежна многа для таго, каб вырашаць свае праблемы. І крызісы — і эканамічныя, і грамадзкія, і экалягічныя — гэта, у прынцыпе, нармальныя працэсы. Упэўнены, што чалавецтва іх пераадолее. Нявырашаныя сытуацыі, канфлікты здараюцца, але ўпэўнены, што яны не фатальныя. Канфлікты ёсьць у многіх краінах, улучна з маёй Радзімай, Грузіяй.

**НБ: Ці даўно былі дома?**

**ЛБ:** Нядаўна. Я кожны год там бываю.

**НБ: Зь якімі ўражаньнямі вярнуліся?**

**ЛБ:** Вельмі цяжкія ўражаньні. Цяпер Грузія знаходзіцца, мне падаецца, у самым цяжкім за апошнае стагодзьдзе становішчы. І галоўнае нават ня тое, што там цяпер вайна. Самае галоўнае — беспэрспэктыўнасьць сцэнараў. Мы ня зможам выйсьці з становішча непераможанымі, і ў гэтым трагедыя нашага народу. Грузіны — бесканфліктныя, мірныя людзі. Мы любім сядзець за сталом, сьпяваць, а не ваяваць. Але на працягу апошніх дваццаці гадоў нам чамусьці не шанцавала... Чаму? Цяжка сказаць. Тут справа нават не ў кіраўніцтве. Справа хутчэй у геапалітычным кантэксьце. Калі б мы жылі ў іншым месцы, дзе мы нікому не былі б патрэбныя, то гэта было б для нас больш бясьпечна. А цяпер... Замежная і ўнутраная палітыка былі ня ўзважаныя. І вось мы маем вынікі.

**НБ: Беларусы ўвогуле мала інфармацыі маюць пра Грузію.**

**ЛБ:** У расейскіх мэдыях, якія дамінуюць у Беларусі ў асьвятленьні падзеяў у Грузіі, аб’ектыўную інфармацыю знайсьці амаль немагчыма. У інтэрнэце ёсьць, канечне, больш аб’ектыўныя крыніцы, але яны недаступныя для большасьці беларусаў. Вельмі складана атрымаць аб’ектыўную інфармацыю і з грузінскіх крыніц. Калі ёсьць вайна — то аб’ектыўнасьці чакаць не прыходзіцца ні ад аднаго з бакоў. Таму высновы можна рабіць толькі самому, пабачыўшы ўсё на свае вочы.

**НБ: Калі я рыхтавалася да размовы, то плянавала пагаварыць з Вамі пра культуру Грузіі, сучасны стан літаратуры. Але пасьля таго, што Вы расказалі, я сумняюся, ці да месца будзе такое пытаньне.**

**ЛБ:** У постсавецкі час грузінская культура разьвіваецца ў складаных умовах. Напрыклад, сучаснаму грузінскаму кіно яшчэ спатрэбіцца час, каб дасягнуць узроўню, на якім яно было, напрыклад, у савецкія часы. А што да літаратуры, дык мне больш падабаюцца грузінскія клясыкі. Здаецца, ніхто з новых грузінскіх пісьменьнікаў іх яшчэ не пераўзышоў.

**НБ: А ці чытаеце нешта зь беларускай літаратуры?**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Леван Буадзэ**

намесьнік кіраўніка офіса Праграмы разьвіцьця ААН у Беларусі. Ён грузін, нарадзіўся і жыў у Тбілісі, там атрымаў эканамічную адукацыю, якую працягнуў у Вялікай Брытаніі. Вось ужо 12 год працуе ў ААН, працаваў у Швайцарыі, Славаччыне, Узбэкістане.

**ЛБ:** Мне цяжка гэта рабіць. Чытаю «Нашу Ніву» (вось ужо тры гады я яе падпісчык), ARCHE, гістарычныя выданьні, вельмі цікаўлюся гісторыяй ВКЛ. Гэта дапамагло асабіста мне адысьці ад стэрэатыпу Беларусі як правінцыі Расеі і прыйсьці да высновы пра тое, што Беларусь — эўрапейская дзяржава, унёсак якой у эўрапейскую культуру і гісторыю вельмі вялікі.

**НБ: Вашыя ўражаньні ад Беларусі і беларусаў?**

**ЛБ:** Самыя добрыя. Я пабачыў, які аблудны стэрэатып, што прадстаўляе беларусаў самымі савецкімі, дэнацыяналізаванымі, адсталымі. За чатыры гады я ўпэўніўся, што гэта ня так. Беларусы — вельмі ўраўнаважаны народ, які вельмі паважае іншыя народы, мае сваю вялікую культуру і мову. Цяпер у мяне шмат сяброў-беларусаў і я часта гавару: «У нас, у Беларусі...» Калі праз некалькі месяцаў я адсюль зьеду, мне будзе не хапаць Беларусі...

**НБ: Вы сказалі раней, што Грузіі не пашанцавала. А Беларусі пашанцавала?**

**ЛБ:** Усё адносна. Калі мы былі малымі і гулялі ў вайну, то не маглі нават уявіць, што калісьці да нас у Грузію прыйдзе сапраўдная вайна. А яна прыйшла. Мы вырашаем канфлікты XXI-га стагодзьдзя мэтадамі XIX-га і XX-га. Вас чара гэтая абмінула.

**НБ: Як Вам падаецца, у гэтым канфлікце беларусы на чыім баку? Грузіі ці Расеі?**

**ЛБ:** Трэба выразна разумець, што гэты канфлікт не паміж народамі. Не паміж грузінамі, асэтынамі, абхазамі, расейцамі. Гэта канфлікт геапалітычнага раскладу. Апошнія дзесяць гадоў Грузія імкнулася на Захад. Добрая ці благая гэта была ідэя... Грузія, як сувэрэнная дзяржава, магла выбраць той ці іншы шлях. І не адна краіна ня мае права дыктаваць іншай яе палітыку. І Расея ня мела права дыктаваць. Але іншае пытаньне, ці ўяўляла нашае кіраўніцтва сур’ёзнасьць намераў Расеі... Трэба ўлічваць палітычныя рэаліі, і ў гэтым сэнсе ў мяне шмат пытаньняў. Не была дасканала пралічаная сытуацыя. І вось мы атрымалі становішча, у якім нам ніхто ня можа ўжо дапамагчы... Гэта найгоршы варыянт з усіх, якія мы маглі мець.

Але нават цяпер, у стане канфлікту, вы не пачуеце ў Грузіі антырасейскіх настрояў і выказваньняў. Таму гэта не канфлікт паміж народамі.

**НБ: А якое можа быць выйсьце? Чым гэта скончыцца?**

**ЛБ:** Як грамадзянін я лічу, што трэба — ня ведаю, як і калі гэта стане магчыма, — узнавіць сур’ёзную дыскусію паміж Расеяй і Грузіяй, каб пераасэнсаваць усё, што мы губляем і набываем. Але гэта неабходна, і гэта адзіны магчымы шлях.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# Джэймз Бонд як валютная прастытутка

У крытычныя дні трэба завітваць у кіно. У дзень нараджэньня былой жонкі я пайшоў на новага Джэймза Бонда. Піша **Павал Касьцюкевіч**.

Мяне як прадстаўніка рафінаванай беларускай інтэлігенцыі абсалютна не турбуе пытаньне храбусьценьня чыпсаў і голаснага трушчаньня папкорну падчас кінасэансаў. Бо ўсё адно тыя чыпсы і папкорн хутка сканчаюцца. Паводле маіх падлікаў, хвілін праз сем. Іх стае адно на рэклямны блёк, дзе гук і так узмоцнены, і на самы-самы пачатак стужкі. Калямбія пікчарс прэзэнту... храбусь-храбусь... І цішыня. Я наагул ня ведаю, нашто такі захуткі кайф — толькі грошы марнаваць. Іншая рэч — семкі!

Усе ўсё ведалі наперад. Ён — бялявая бэстыя, падперазаны «Узі» і «Ролексам». Яна — балівійская шпіёнка: падсмажаная да храбусткай скарынкі ў галівудзкім салярыі Воля Кірыленка. Усе астатнія — дыктатары і маньякі агульнапляпэтнага маштабу, і яны паталягічна хочуць сьмерці тандэму. Гэта ўсё — з фронту, у лоб. А зьлева: «Лёша, ты сьпіш?» — «Не, ня сплю, ты што — мы ж грошы заплацілі».

Сацыяльная карысьць такіх фільмаў відавочная. Чалавек, які паглядзеў «Джэймза Бонда», забіваць ня пойдзе. Прынамсі да панядзелкавага вечара. Нават калі ў яго пад ложкам напагатове кулямёт «максім». «Ну, хто я з сваім сьмешным трупам цешчы супраць гэтага эвэрэсту целаў?». А там глядзіш і карпаратыўчык нейкі ў сераду ўвечары вытанцоўваецца — зьяўляюцца іншыя стымулы ў беззаганным жыцьці незабойцы. Раніца ў чацьвер: забіць сябе хочацца значна больш, чым астатніх. Цудоўнае ўваскрашэньне ў пятніцу. Субота — сьвяты дзень паводле ўсіх рэлігіяў, і нічога кепскага ў ім быць ня можа паводле азначэньня. А там глядзіш і — Sunday, I'm in love зноў. Тут галоўная задача работнікаў мастацтва — у небясьпечным пункце чалавечага жыцьця своечасова падсунуць чарговага Бонда, антыкілера цешчаў.

Нам утульна ў нашых фатэлях. А мастакам утульна ў іхных. «Ну, што: па дваццатым разіку «Брыльянтавую руку»?» — «Фі, не, мы толькі «Кін-дза-дза» і максымум восьмы раз». У сучасным мастацтве, як з просьбамі да Дзеда Мароза: хто што хацеў, той тое і атрымаў. У разумных межах, вядома. Ты просіш у мастацтва фільмец з разгэтакай машынкай у кадры ці супэр-лялькай у галоўнай ролі, і асабіста запісваеш гэта на паперцы і перадаеш праз бацькоў, і сантакляўс-мастацтва — будзь спок — выканае. А якасную нямецкую дзіцячую чыгунку, што праносіцца праз глухія тунэлі нашага існаваньня? Хоць ты галавой аб сьцяну бійся — усё адно не атрымаеш. Максымум на закрытых праглядах для пяці чалавек. Гэта ж разумее кожны дзетсадавец.

Што далей скажуць амэрыканцы? Ну, прывітаньне! — яны ўжо ўсё сказалі. Нават самыя зацятыя ненавісьнікі ўсяго заакіянскага даволі хутка высьветлілі, што штатаўцы тут амаль ні пры чым. Можна, вядома, па-дзіцячы надзьмуць вусны і з понтам прамовіць: «Яны першыя пачалі!», і гэта так, але... Але гляньце навокал. Культура служыць нам, выконвае нашыя хоцькі. Асабліва тут, дзе ўсё круціцца вакол дзіцячых мараў: куплі машынкі і фанатычных пошукаў стасункаў тыпу «прынц—прынцэса».

Праўдзівае мастацтва калі ёсьць, то ёсьць. Там шмат чаго незразумелага, нязнанага, там імправізацыя, жывое жыцьцё, там мастак гуляе паводле сваіх, а не глядацкіх правілаў. І чыя віна, што той гатунак у масавым парадку пакінуў сёньня галерэі, канцэртныя залі і кінатэатры. А як ён не жадае, ці то ня можа даходзіць да публікі, і таму людзі ў моц сваіх здольнасьцяў бяруць яго рабленьне ў свае рукі. Здаецца, у фальклярыстаў гэта называецца побытавай культурай.

Культурны цэнтар краіны цяпер не ў Палацы мастацтваў і нават не ў Палацы Рэспублікі. Ён — на будаўнічым рынку ў менскім мікраараёне Уручча.

Такога шчырага натхненьня, сцэнаў такога напалу я даўно ня бачыў. У людзей, калі яны малююць пляны сваіх будучых інтэр'ераў моў паветраныя замкі, твары аквечаныя шчырым узьвівам фантазіі. Назіраць, як перад увaходам у палатку нейкая пара ў жанры пантамімы пачынае плянаваць яшчэ недабудаваны дом. Як карцінна, зусім не па-тутэйшаму кабеты кідаюць сваім партнёрам тэатральныя фразы: «Я — жанчына, і я тут вырашаю!» Тут кожнага чалавека зацягвае ў вір пачуцьцяў і стракатай ляка-фарбаванай імпрэзіі. Там запраста можна перастрэць і Калёпу са шпалерамі, і ўбачыць, як увіхаецца Тэрпсыхора з фаянсавым бачком. І ідэальныя дэкарацыі — ахайна абабітыя сайдынгам крамы, а таксама прадаўцы рынку ў ролі масоўкі толькі дадаюць сюжэту драматычнасьці ці камічнасьці — каму што падабаецца. І вось антракт — зьняможана паваліцца на плястыкавае крэсла і ў тутэйшым тэатральным буфэце зьесьці порцыю сгреs з варанай згушчонкай. Другая дзея: танцы, сцэны з народнага жыцьця. Галоўны герой падыходзіць да гераіні і як бы фліртуючы, у форме жартаўлівай арыі прапануе ёй набыць італьянскую кухню зь бясплатнай дастаўкай на дом. І, топячыся ў штапіках і плянках, усё роўна як абвешаныя букетамі прымадонны, мы, атрымалыя сваю порцыю культуры, вяртаемся дамоў. Карэту нам, карэту!

Маленькія трагедыі з будаўнічага рынку нагадалі мне яшчэ адну гісторыю. Пра майго дзеда. Ён быў такім жа (між)вольным мастаком. У свой час, калі «справа дактароў» распаўсюдзілася ня толькі на дактароў, але і на саміх работнікаў пракуратуры адпаведнай нацыянальнасьці, дзед, звольнены з органаў, зрабіўся пазаштатным юрыдычным кансультантам на адным зь менскіх заводаў, да канца жыцьця заглыбіўшыся ў два заняткі, вядомыя сваім дабратворным уплывам на душу мужчыны: залёты і павышэньне ўласнага дабрабыту.

Акрамя гэтых дзьвюх рэчаў у дзеда было хобі — ён выбіваў ільготы.

Рэч у тым, што паводле савецкага заканадаўства інвалідам вайны (а дзед прайшоў усю вайну) акрамя дармавых праездаў у грамадзкім транспарце належала процьма ўсяго: цэлая сыстэма, як бы мы цяпер сказалі, зьніжак, шматлікія падарункі ад разнастайных арганізацыяў і г.д. Мала хто з вэтэранаў ведаў пра тое. У ліку нешматлікіх — мой дзед-юрыст.

Дзед выбіваў усё. Пасярод вясны ў нас у

Культурны цэнтар краіны цяпер не ў Палацы мастацтваў і нават не ў Палацы Рэспублікі. Ён — на будаўнічым рынку ў менскім мікраараёне Уручча.

духоўцы расьцьвіталі калюмбійскія бананы, Куклачоў усьміхаўся толькі нам, дзедавым унукам, што сядзелі ў першых шэрагах; белыя цеплаходы забіралі нас на круізы па Залатым кальцы з выездам у акваторыю на Краснай плошчы. Калі б на палёты ў космас была б квота для вэтэранаў ВАВ, дык я проста ўпэўнены, што менавіта мой стрыечны брат Аркаша зрабіўся б першым дзіцём-касманаўтам. Дзед, далёкі ад мастацтва чалавек, быў праўдзівым творцам, жанглюючы дэкрэтамі як цыркач. З натхненьнем сьлізбуючы доўгія лісты ў міністэрствы, з элегантнасьцю падсоўваючы корачку вэтэрана вайны, зь нязмушанасьцю творцы выбіваючы з чыноўнікаў усё, што яму належала. І заўважце, ніякага блату ці сваякоў у Саўміне. Хутчэй наадварот, усе супраць нашага дзеда, але ён ня шыла зь перцам. Сапраўднае мастацтва — яно трошкі на злосьць навакольнай несвабодзе. Не забуду ягонай найгранай акторскай абыякавасьці, калі ён па прыходзе да нас дадому даставаў перад нашымі захопленымі вачыма чарговага тлустага труса з капелюша. О так, гэта заслугоўвала апладысмэнтаў!

Вядома, пры вялікім жаданьні і фантазіі ў сцэнках зь менскага будаўнічага рынку можна шукаць і знайсьці паралелі зь іншымі спаконвечнымі ліцьвінскімі забавамі: паляваньнем на янотаў, паходамі на Масковію. Але я настойваю на мастацтве. Хочацца, ведаеце, культурных параўнаньняў, чалавечных мэтафар. І як манархія, то прынамсі асьвечаная.

З усіх прафэсійных мастакоў рад(т)уе адзін Кадафі. Сваёй шчырусенькай заангажаванасьцю ў цяжкіх думах пра лёс чалавецтва. Ён для сябе ўжо ўсё даўно вырашыў: ён усёй душой за сілы Дабра і хоча прыносіць людзям толькі ўцеху. Збольшага сваім суайчыньнікам. Ну, і там, калі выпадзе выехаць за мяжу, дык і іншаземцам таксама будзе дазволена пагрэцца ў прамянях ягонага таленту рэжысёра-пастаноўшчыка культурна-масавых мерапрыемстваў. Паглядзіце яшчэ раз на ягоныя здымкі ў Менску, зробленыя Юляй Дарашкевіч. Гэта ж опэра, сымфонія, «Аіда» і «Выбраньніца» на адной сцэне. Хіба вярблюдаў у Ждановічы забылі падагнаць. Наперад, Кадафі! Задай, даражэнькі, гэтаму гідкаму Бонду, гэтаму гнюсотнаму Джэймзу Бонду, капітальную прачуханку, ату яго! Сьмерць фальшываму мастацтву!

## КАДРЫ



**СЬЛЕДАМ ЗА ЛЮДЗЬМІ.** Сьнегавікі цяпер часьцей трапляюцца з бутэлькамі, чым з морквай.

Лявон К

## IN MEMORIAM

**Алег Лойка**

19 лістапада ў Слоніме пасьля працяглай хваробы на 78-м годзе жыцьця памёр літаратуразнавец, былы дэкан філфаку БДУ.

Ён пакінуў па сабе ўдзячную памяць усіх тых, каму выпала ня толькі чытаць, а і слухаць прафэсара філфаку Белдзяржунівэрсытэту. Многія зь ягоных выхаванцаў сталі вядомымі ў краіне дасьледчыкамі.

Гаворыць паэт Міхась Скобла: «Роўна сто кніг выдаў паэт, навуковец, перакладчык, выкладчык, прафэсар Алег Лойка. Гэта велізарная праца. Яна была пад сілу толькі чалавеку, які не шкадаваў сябе. Асабліва хацелася б адзначыць ягоную двухтомавую анталёгію польскай паэзіі «Ад Бугу да Віслы», куды ўвайшлі вершы ста васьмідзесяці паэтаў».

За месяц да свайго сыходу Алег Лойка адправіў у выдавецтва рукапіс сваёй апошняй, сто першай кнігі — гэта ўспаміны пра Караткевіча.

Пахаваны Алег Лойка будзе ў пятніцу 21 лістапада ў родным Слоніме, дзе жыў апошнія гады. У яго засталіся дачка Антаніна, сын Павал і ўнукі Віталь, Алег і Надзея.

Радыё «Свабода»

## НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

# Маскоўскі «Скарыніч»

**Скарыніч: Літ-навук. Гадавік. Вып. 7.** Масква: Советский писатель, 2008, 216с. 200 ас.

У Маскве выйшаў чарговы, сёмы, нумар, альманаху «Скарыніч». Выпуск прысьвечаны пераважна гістарычна-культурнай прысутнасьці беларусаў у маскоўскім асяроддзьдзі і беларуска-расейскім узаемадачыненьням.

Кола аўтараў — надзвычай шырокае: ад Сімяона Полацкага да Вячаслава Кебіча (урывак з мэмуараў). Апавяданьне на беларускую тэматыку Аляксандра Твардоўскага. Архіўны жанр: рэдкія пастановы ЦК КПБ пра беларускія зямляцтвы ў Маскве і Ленінградзе і адзін з апошніх лістоў літаратуразнаўцы Генадзя Кісялёва. Уклаў альманах Аляксей Каўка.

# Гутарка зь Пецем Сеўруком

У сваіх артыкулах, лістах і нататках ён настолькі дакладна спрагназаваў эвалюцыю беларускага нацыянальнага руху пад Польшчай, што гэта высоўвае яго ў лік найбольшых беларускіх інтэлектуалаў таго часу. Пра Пятра Сеўрука і кнігу ягонай спадчыны піша Андрэй Вашкевіч.



**Удзельнікі акруговага зьезду ТБШ у Горадні. 12 ліпеня 1928 году. У другім шэрагу 3-і зьлева — Аляксандар Уласаў, 4-ы — Рыгор Шырма. У трэцім шэрагу 2-і зьлева — Пётар Сяўрук.**

Толькі цяпер, калі збор твораў Пятра Сеўрука ляжыць у мяне на стале, я пачынаю ўсьведамляць, як многаму навучыў мяне Пётар, і ўжо не зьдзіўляюся, што Данута Бічэль называе Багдановіча «сваім Максімкам». Данута Янаўна бачыла «свайго Максіма» толькі ў снах, я пачынаў «гаварыць» зь Пецем Сеўруком толькі калі да самай раніцы заседжваўся над ягонымі рукапісамі, але, тым ня менш, гэты скідальскі хлопец, які памёр у 1929 г., стаў мне бадай што сябрам.

Безь Пятра Сеўрука не было б маёй сустрэчы зь Янкам Брылём, знаёмства зь Міколам Дзелянкоўскім, я ніколі не адкрыў бы для сябе слаўнай змагарнай гісторыі беларускага Скідаля, не дакрануўся б да талстоўскага руху ў Заходняй Беларусі 1920—1930-х ды, мабыць, ня хутка адчуў бы ўсю веліч генія таго «сумленьня Расеі» пачатку XX ст., якім быў Леў Талстой.

Гісторыя «сяброўства» зь Пятром Сеўруком пачалася больш за чатыры гады таму, калі я, толькі пачаўшы працаваць у музэі, знайшоў паміж іншых папераў, што ляжалі ў бясконцых шафах нашага аддзелу, стосік пажоўклых сшыткаў, сьпісаных цьвёрдым дробным почыркам. Сшыткі аказаліся рукапісамі грамадзкага дзеяча і паэта 1920-х са Скідалю Пятра Сеўрука. Дзёньнік, вершы, празаічныя і філязофскія творы, ліставаньне з Антонам Луцкевічам, Ігнатам Дварчаніным, Зоськай Верас, талстоўцамі і эспэрантыстамі з усяго сьвету, — усё гэта зьбіралася ўжо пасьля, пасьля паездак у Скідаль, калі сваякі Пятра, урослыя ў ягоныя паперы, як бедныя шляхцічы ў старыя каралеўскія граматы, пакрысе пагаджаліся перадаць іх музэйным шафам.

А з прачытаньня і асэнсаваньня адшуканага нараджаўся абавязак — захаваць, апрацаваць і хоць крыху данесьці да іншых. Так пачалася праца, якую натхнёна падтрымалі вельмі многія людзі.

У 1986 г., як толькі патыхнула больш свабодным паветрам, Янка Брыль з дапамогай Міколы Дзелянкоўскага ўгаварыў сястру Пятра Марыю дазволіць надрукаваць падборку вершаў свайго брата. Гэтыя вершы, надрукаваныя ў «ЛіМе» і «Полымі», былі прызнаныя літаратурным адкрыцьцём году. Прачытаўшы іх, Мікола Ўлашчык у адным з сваіх лістоў зазначыў: «Гэты хлопец ня быў Багдановічам, але мы павінны ведаць сваё мінулае».

У сваіх артыкулах, лістах і нататках гэты малады хлапчук настолькі дакладна спрагназаваў трагедыю далейшай эвалюцыі беларускага нацыянальнага руху пад Польшчай у бок фанатычнага даверу да савецкай улады, што гэта безь перабольшваньняў высоўвае яго ў лік найбольшых беларускіх інтэлектуалаў таго часу.

Чалавек вялікіх здольнасьцяў, ён вельмі хацеў вучыцца, аднак лёс падрыхтаваў яму толькі цяжкую сялянскую працу і пастаянныя візыты п’яных польскіх паліцыянтаў, якія лічылі яго небясьпечным камуністычным агітатарам. Але Сяўрук дзейнічаў толькі «згодна свайму сумленьню». Хворы на сухоты, негаваркі, занадта сур’ёзны ў параўнаньні з аднагодкамі, Пётар Сяўрук у 1926—1929 г. літаральна падняў Скідальшчыну на барацьбу за правы беларусаў у Польшчы. Думаю, не перабольшу, калі скажу, што беларускай Скідальшчына ўсьвядоміла сябе найперш дзякуючы яму.



**Пячнік з падскідальскіх Пузавіч, былы грамадовец і сваяк Сеўрука Даніла Скварнюк загінуў разам з аднавяскоўцамі ў 1943 г., стаўшы прататыпам героя апавяданьня Янкі Брыля «Memento mori».**

Духам Пятра Сеўрука натхняліся многія. Яшчэ ў 1937 г. да яго сваякоў у Скідаль прыехаў малады Янка Брыль. Гэта Сеўрукоў найбліжэйшы сябра і швагер, пячнік з падскідальскіх Пузавіч Даніла Скварнюк, стаў прататыпам галоўнага героя апавяданьня «Memento mori», пайшоўшы на сьмерць разам з аднавяскоўцамі, хоць мог выратаваць жыцьцё сабе і сваім блізкім. Кнігі зь бібліятэкі створанага Сеўруком гуртка ТБШ чыталі будучыя скідальскія падпольшчыкі, павешаныя нацыстамі на мястэчковым рынку ў верасьні 1942 г. У пачатку 1960-х дакумэнты з архіву Сеўрука цытаваў Уладзімер Калесьнік. Малодшы брат Пятра, Міхась Сяўрук, які Пятра зусім бадай і ня помніў, стаў пасьля настаўнікам і журналістам. Падчас выступленьня на ўрачыстым мітынгу з нагоды 50-годзьдзя ўзьяднаньня Беларусі яму стала дрэнна, і ён памёр каля самай трыбуны. Яго пляменьнік — журналіст і пісьменьнік Мікола Дзелянкоўскі — адзін з самых цікавых апавядальнікаў, якіх мне даводзілася слухаць.

Цяпер сказанае і зробленае Сеўруком, цудоўным чынам захаваўшыся да нашага дня, можа стаць і вашым набыткам. Кніга «Небыцьця не існуе...» складаецца з шасьці разьдзелаў: публіцыстыка, філязофскія развагі, паэзія, празаічныя творы, ліставаньне і ўрыўкі дзёньніка Пятра Сеўрука. Том таксама забясьпечаны жыцьцяпісам яго аўтара і ўсім неабходным навуковым апаратам. Прадмовы напісалі беларускі гісторык зь Беластоку Яўген Мірановіч і адзін з патрыярхаў польскай гісторыяграфіі беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай прафэсар Ежы Тамашэўскі.

Ад свайго імя і імя Сяргея Токця хачу падзякаваць усім, без чыёй дапамогі выданьне гэтай кнігі было б немагчымым: родным Пятра Сеўрука, супрацоўнікам Гарадзенскага музэю Максіма Багдановіча, гісторыкам Алесю Пашкевічу і Зьміцеру Люціку і, безумоўна, актывістам гарадзенскага «Руху «За Свабоду» і асабіста Аляксандру Мілінкевічу.

Вялікі дзякуй і ўроцлаўскім сябрам, якія выдалі кніжку ў такой добрай якасьці. Ня хочацца называць гэта сплочваньнем нейкага доўгу, але той факт, што менавіта ў Польшчы, а не ў Беларусі выйшла першая кніжка Пятра Сеўрука, бясспрэчна, сымбалічны.

Усіх, хто цікавіцца беларускай гісторыяй і літаратурай, запрашаю правесьці колькі гадзінаў сам-насам з гэтым інтэлігентным і шчырым хлопцам, які пражыў так мала, але пасьпеў так шмат зрабіць і сказаць людзям. Яму будзе прыемна пагаварыць з Вамі.

Прэзэнтацыя кнігі Пятра Сеўрука з удзелам укладальнікаў прайшла ў Горадні на сядзібе ТБШ (вул.Будзённага, 48а) 27 лістапада. Кнігу можна набыць у незалежных распаўсюднікаў.




**Сяўрук Пётр. «Небыцця не існуе...»** / Пётр Сяўрук; уклад., прадм., камэнт. Андрэя Вашкевіча, Сяргея Токця. — Горадня—Уроцлаў, 2008.

### Пётр Сяўрук. Пра беларускую прэсу

Калі ўважліва прыгледзімся, чым займаюцца цяпер беларускія газэты, пачынаючы ад крайніх «левых» ды канчаючы крайнімі «правымі», дык убачым, што ўсе яны займаюцца пераважна палітыкай і лаянкай, прычым палітыка робіцца лаянкай, а лаянка набывае значэньне палітыкі. З гэтага вар’яцкага злучэньня лаянкі і палітыкі нараджаецца беларуская палітычная прэса.

Зацікавіць народ, гэтаксама як зацікавіць дзяцей, вельмі лёгка, але пытаньне ў тым, ці гэта адпавядае мэтаду разумнага выхаваньня і адукаваньня. П’яная бойка на вуліцы таксама цікавіць дзяцей, але ніводзін пэдагог пэўна ня лічыць гэта ўрокам сталеньня.

Дзейнасьць на ніве народнай асьветы і народнага выхаваньня павінная заўсёды адпавядаць пэдагагічным мэтадам, бо інакш нашая дзейнасьць будзе мець уласьцівасьці тых выхавальнікаў, якія не выкоўваюць, а дэмаралізуюць народ.

Дзеячы народныя, як і пэдагогі, павінны ведаць свае межы. Яны могуць біцца, сварыцца і лаяцца, дзе іх ня бачаць, але ні ў якім разе не павінны рабіць гэта перад масамі, перад тымі, каго яны выхоўваюць і яшчэ больш не павінны з гэтага рабіць сыстэмы выхаваньня.

### Be2gether абапал мяжы

Арганізатары найбуйнейшага балтыйскага фэстывалю рок-музыкі Be2gether маюць намер правесьці наступны фэст па абодва бакі літоўска-беларускай мяжы, паведаміў заснавальнік і генэральны прадусар Be2gether Гендрус Клімкявічус. Са словаў пасла Літвы ў Беларусі Эдмінаса Багдонаса, адну сцэну мяркуецца разьмясьціць на тэрыторыі Літвы, а другую — у Беларусі. «Такім чынам, мы плянуем з дапамогай музыкі адчыніць межы паміж дзьвюма краінамі, бо нашыя народы яднае векавая гісторыя», — адначыў Багдонас.

# БАТЭ прайграў. Слава БАТЭ!

Дзякуючы БАТЭ цікавасьць да футболу ў краіне ўзрасла ў дзясяткі разоў. Напэўна, зьявіліся прыросты ў наборах дзіцячых футбольных школ. Каму з малых ня хочацца быць падобным на Гену Блізьнюка ці Ігара Стасевіча? Піша **Зьміцер Панкавец**.



Юлія Дарашкевіч

Калі ішоў у аўторак на стадыён глядзець матч БАТЭ — «Рэал», успомнілася, што ў першыя гады незалежнасьці ў нашых шыротах ужо быў адзін летуценьнік, галоўны трэнэр старадароскага «Будаўніка» Аляксандар Жукавец, які абяцаў прывесьці ў Беларусь мадрыдзкі «Рэал». Тады гэта падавалася фантастыкай. Але прайшло ўсяго пятнаццаць гадоў, як іншы правінцыйны летуценьнік барысавец Анатоль Капскі, зьдзейсьніў гэтую мару. Што праўда, самы тытуляваны клюб сьвету не прыехаў у Барысаў, але і ў Менску яго ўбачыць — яшчэ той падарунак.

Рэдактар газэты «Салідарнасьць» Аляксандар Старыкевіч перад пачаткам гульні на маё пытаньне пра шанцы нашых іранічна зазначыў: «Лёд пакажа». Чаго крывіць душой, менавіта на неспрыяльнае для гішпанцаў надвор’е мы і разьлічвалі. Ня так ужо і часта мадрыдцам даводзіцца гуляць пры мінусавай тэмпэратуры. Зрэшты, як паказаў матч, падобныя спадзяваньні былі досыць наіўнымі.

Яшчэ толькі заходзячы на «Дынама» зьвярнуў увагу, што чэргі не такія вялікія, як перад мінулымі гульнямі. Узьнікла падазрэньне, што маразоў маглі спалохацца ня толькі цеплалюбівыя гішпанцы, але і тутэйшыя заўзятары. Але вольных месцаў на стадыёне амаль не было. Апошні акорд менскай восені ў заўзятарскім выкананьні прагучаў годна. Перад пачаткам гульні ўсе трыбуны імгненна перафарбаваліся ў жоўты і сіні колеры БАТЭ. Відовішча ўражвала. А на фанацкім сэктары зьявіліся партрэты гульцоў і трэнэраў.

У пачатку матчу было відавочна, што БАТЭ хацеў паўтарыць бліцкрыг, які атрымаўся падчас гульні зь «Ювэнтусам». Запомнілася, як на першых хвілінах нападнік Віталь Радзівонаў заклікаў сваіх партнёраў прэсінгаваць «Рэал» на яго палове поля. БАТЭ быў настроены па-баявому.

Толькі ўжо літаральна праз пару імгненьняў адбылася трагедыя ля варот Верамка. Юрэвіч не дацягнуўся да флянгавай перадачы і Рауль застаўся адзін на адзін у штрафной пляцоўцы з нашым брамнікам. Чалавек-эпоха Рауль такіх памылак супернікам не даруе. Ён дакладна накіраваў мяч пад барысаўскую перакладзіну. Гэта адбылося ўжо на восьмай хвіліне.

Шчасьцю імпульсіўных гішпанскіх камэнтатараў не было мяжы. Напэўна, слова «гоооооооол» яны крычалі ня менш, чым хвіліну кожны. Вось і задумаесься пасьля гэтага пра ўзровень нашых майстроў спартовага слова, пад камэнтар якіх часам хочацца заснуць.

У футболе няма нічога больш непрадказальнага, чым гульня пасьля хуткага голу. Ніколі не ўгадаеш, чым гэта можа скончыцца для абодвух бакоў.

Было добра бачна, што «Рэал» — гэта наймацнейшы клюб, які ступаў на стадыён «Дынама» сёлета. Яшчэ б — у складзе мадрыдцаў былі Ікер Касільяс, Рауль Гансалес, Серхіё Рамас, Хаўер Савіёла, Гуці, Рафаэль ван дэр Ваарт. Але БАТЭ ўжо неаднакроць даказвала, што ў футбол гуляюць не імёны.

Нашы мелі шанцы, каб забіць. Нямнога, але яны былі. «Рэал» таксама мог рабіць лік большым, але ратавалі абаронцы, які па-хакейнаму, усім целам, кляліся пад удары, а таксама Верамко. «Рэал» так і перамог зь мінімальным лікам — 1:0.

БАТЭ застаецца правесьці адзіны матч у групавым этапе — 10 сьнежня ў Турыне яны сыграюць зь «Ювэнтусам». Гэта гульня для турнірных пэрспэктываў барысаўцаў ужо нічога ня значыць: яны і так, і так займаюць чацьвертае месца ў групе.

Як бы нам ні сумна было гэта ўсьведамляць, але фантастычная менская футбольная восень скончылася. Лішне казаць, што дзякуючы БАТЭ цікавасьць да футболу ў краіне ўзрасла ў дзясяткі разоў. Людзі суткамі былі гатовыя стаяць ля касаў стадыёну, каб патрапіць на гульню, а ў пошуках «лішняга білеціка» былі гатовыя выкладваць шалёныя грошы. Напэўна, зьявіліся прыросты ў наборах дзіцячых футбольных школ. Каму з малых ня хочацца быць падобным на Гену Блізьнюка ці Ігара Стасевіча?

Хочацца, каб гэта ня быў канец беларускай футбольнай ліхаманкі, каб яна перайшла ў наступны год, каб на матчы ўнутранага чэмпіянату не хадзіла няшчасная тысяча аматараў. Аднаго лякальнага посьпеху БАТЭ для такога прарыву яшчэ мала, але ён пакідае надзею. Мы нарэшце займелі каманду за якую ня сорамна.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### У супэрфінале

Менскі «Керамін» заваяваў пуцёўку ў супэрфінал Кантынэнтальнага кубку па хакеі. Паўфінальныя матчы праходзілі ў Ліепаі (Латвія). У вырашальным паядынку менчукі адолелі гаспадароў пляцоўкі — «Мэталюргс» — зь лікам 5:2. Фінальны турнір пройдзе ў францускім Руане з 16 да 18 студзеня.

### У Гомелі знойдзены труп непаўналетняй

У гомельскім мікраараёне Гомсельмаш знойдзены труп непаўналетняй. Цела было знойдзена раніцай 19 лістапада, яно вісела на дрэве насупраць школы. Па факце сьмерці распачата крымінальная справа.

### У Гвінэі беларус ня вынес разьвітаньня з радзімай

…і зрабіў сабе сьмерць. Апошнія два гады Валер Цімашчэня і яшчэ чацьвёра маракоў з каманды рыбалавецкага траўлера не маглі вярнуцца з Афрыкі, бо не было грошай. Маскоўская кампанія, зь якой яны падпісалі кантракт, не плаціла ім заробку. Да адʼезду ў Афрыку Цімашчэня жыў у расейскім Караляўцы.

Цяпер вырашаецца пытаньне транспартаваньня цела марака на радзіму.

Як патлумачылі тэлеканалу СТВ у дэпартамэнце па грамадзянстве й міграцыі Міністэрства ўнутраных справаў Беларусі, такія выпадкі хутчэй вынятак, і здараюцца праз тое, што людзі не валодаюць у дастатковай ступені інфармацыяй пра тую краіну, куды едуць працаўладкоўвацца, а таксама пра працадаўцу, якому давяраюць свае лёсы.

### Жыхар Віцебска заклікае пакараць вытворцаў гарэлкі «Бульбаш»

Сяргей Каваленка накіраваў у пракуратуру скаргу на прадпрыемства «Дыяніс». Ён лічыць, што назва гарэлкі «Бульбаш» абражае нацыянальную годнасьць беларусаў і ў прыватнасьці самаго спадара Каваленкі як прадстаўніка беларускай нацыі.

Паводле Сяргея Каваленкі, слова «бульбаш» у беларускай мове не існуе, і яно ўзьнікла ды ўжываецца як зьняважлівая мянушка беларусаў. Таму Каваленка патрабуе распачаць крымінальную справу ў адносінах да вінзаводу на факт публічнай абразы нацыянальнай годнасьці і распальваньня нацыянальнай варожасьці.

Перад тым, як зьвярнуцца ў пракуратуру, Сяргей Каваленка напісаў на прадпрыемства ліст, у якім растлумачыў сваю пазыцыю. Але кіраўніцтва заводу ў афіцыйным адказе абвінаваціла спадара Каваленку ў тым, што гэта менавіта ён распальвае нацыянальную варожасьць, калі нагадвае аб сапраўдным значэньні слова «бульбаш».

### Дзе маё сала?

Адказ на гэтае пытанне 63-гадовы жыхар вёскі Любань Кастрычніцкага раёну цяпер шукае разам зь міліцыяй. Невядомы забраўся да яго ў дом і непрыкметна выкраў 15 кілаграмаў сала і 10 кілаграмаў мяса. А вось у Жыткавіцкім раёне зламысьнікам не пашанцавала. Двое непрацуючых і раней судзімых грамадзян спакусіліся на магазін у пасёлку Азёрны. Ноччу сарвалі навясныя замкі і трапілі ў краму, дзе выкралі каштоўнасьцяў на суму больш за 6 мільёнаў рублёў. Злодзеі, жыхары вёскі Дуброва, 30 і 40 гадоў, былі затрыманыя разам з часткай выкрадзенага.

### Ад гвалту гіне больш жанчын, чым ад раку і войнаў

Праблема гвалту над жанчынамі разраслася да маштабаў эпідэміі, — заяўляюць у ААН.

Як мінімум кожную трэцюю жанчыну ў сьвеце хоць раз у жыцьці зьбівалі, прымушалі да інтымнай сувязі альбо іншым чынам прыніжалі. Пры гэтым у ролі гвалтаўніка, як правіла, аказваецца знаёмы мужчына. Сярод жанчын ва ўзросьце ад 15 да 44 гадоў гвалт — самая распаўсюджаная прычына сьмерці і інваліднасьці. Паводле праведзенага Сусьветным Банкам дасьледаваньня, сярод 10 фактараў рызыкі, вызначаных для гэтай катэгорыі жанчын, згвалтаваньні і побытавы гвалт апынуліся паводле рэйтынгу вышэй за рак, войны і малярыю.

Згодна з дадзенымі Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя, больш за палову жанчын Бангладэш, Пэру, Танзаніі і Эфіёпіі прызналіся, што зазнаюць фізычны альбо сэксуальны гвалт з боку блізкага чалавека, а ў сельскіх раёнах Эфіёпіі гэты паказчык дасягае 71 працэнта. Не абышла гэтая праблема і заходнія краіны — у Вялікай Брытаніі гэты паказьнік склаў 30 працэнтаў, у ЗША — 22. Разам з тым, паводле апытаньняў жанчын у 10 розных краінах, ад 55 да 95 працэнтаў жанчын, якія зазналі фізычны гвалт ад мужоў ці палюбоўнікаў, ніколі не зьвярталіся па дапамогу ні ў паліцыю, ні ў грамадзкія арганізацыі.

У Беларусі афіцыйныя справаздачы Міністэрства ўнутраных справаў штодня рэгіструюць каля 200 паведамленьняў пра сямейныя канфлікты. Па-за паперамі і заявамі застаецца невядома колькі тых, хто не жадае зьвязвацца зь міліцыяй. Паводле інфармацыі міжнароднай праваабарончай арганізацыі Amnesty International, штогод каля трох тысячаў беларускіх жанчын церпяць ад гвалту ў сямʼі.

### Віягру могуць прызнаць допінгам

Кіраўнік Сусьветнага антыдопінгавага агенцтва Дон Фэйхі прызнаўся, што экспэрты ягонай арганізацыі дасьледуюць віягру — вядомы ва ўсім сьвеце прэпарат ад мужчынскага бясьсільля. Адмыслоўцы правяраюць гэты прэпарат на прадмет уключэньня ў сьпіс забароненых да ўжываньня рэчываў. Як вядома, віягра дабратворна ўплывае на працу сардэчнай цягліцы, пашырае сасуды, спрыяе лепшай цыркуляцыі крыві, а ў выпадку са спартоўцамі — значна павялічвае трывушчасьць арганізму. Са словаў Фэйхі, рашэньне па занясеньні віягры ў допінг-ліст пакуль не прынятае, а калі гэта адбудзецца, то яго павінна будзе зацьвердзіць камісія Антыдопінгавага агенцтва.

**Паводле cz, радыё «Свабода», «Звязда», БелаПАН, радыё «Рацыя», «Эўрарадыё», блогу Сяргея Чарнавокага**







## ВЫСТАВЫ

**Творы Рэнаты Баэра**

**У Мастацкім музэі да 4 сьнежня** працуе выстава мастачкі з Італіі Рэнаты Баэра. У творах Рэнаты Баэра галоўнае — жывапісная матэрыя. Колер, шчыльны і густы, надае перакanaўчасьць і рытм кампазыцыі, вольнай ад канкрэтнага вобразу.

**Выявы-2008**

**6 сьнежня ў Тэатры рускага рамансу (Чыгуначная, д. 27, корп. 2)** адбудзецца прэзэнтацыя літаратурна–мастацкага праекту «Выявы–2008», што мае на мэце прадставіць адразу некалькі кірункаў разьвіцьця найноўшай беларускай культуры: літаратурны, музычны і візуальны. Вас чакаюць выступленьні маладых паэтаў, якія будуць ня толькі чытаць вершы, але й пакажуць свае адмысловыя праграмы. **Пачатак а 18-й.** Квіткі 5000. Даведка і заказ квіткоў праз т.: (029) 560–77–93, 135–44–95 або праз e–mail: vuavu@list.ru.

**Выстава Валер'я Лабка**

**У галерэі візуальных мастацтваў NOVA (Харужай, 16) да 14 сьнежня** працуе выстава памяці Валер'я Лабка «Вяртаньне. Крок другі».

**Успамін пра Дабраўляны**

**У мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 6 сьнежня** працуе выстава «Ўспамін пра Дабраўляны» — па–мастацку ўвасобленыя ўражаньні ад сутыкненьня з творчай спадчынай беларускага мініятурыста Казімера Бахматовіча.

**Паўза. Шчасьце. Танец**

**У Доме-музэі 1 зьезду РСДРП (пр.Незалежнасьці, 31а) да 22 сьнежня** працуе выстава графікі Рамана Кароткіна «Паўза. Шчасьце. Танец».

**Танцавальная вечарына**

**30 лістапада ў актавай залі цэнтру пазашкольнай працы «Кантакт» (пр. Пераможцаў, 79) з 19-й да 22-й гадзіны** — беларускія, латыскія, брэтонскія, сярэднявечныя танцы пад жывую музыку! Уваход: 5000.

## КАНЦЭРТЫ

**Барока на Залатой Горцы**

**У менскім касьцёле Найсьвяцейшай Тройцы (Сьвятога Роха) 29 лістапада** адбудзецца канцэрт старадаўняй музыкі эпохі Барока. **Пачатак а 20-й.** Уваход вольны.

**Neuro Dubel**

**1 сьнежня ў «Графіці» (зав.Калініна, 16) а 20-й** — сольны канцэрт Neuro Dubel.

**Лявон Вольскі**

**4 сьнежня — «Графіці» а 20-й** — сольны праект «Куплеты і прыпевы» Лявона Вольскага.

**Канцэрт францускай сьпявачкі Дафнэ**

**1 сьнежня ў вялікай залі Філярмоніі** — канцэрт францускай сьпявачкі Дафнэ. **Пачатак а 19-й.**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**28 (пт)** — «Вечар»
**29 (сб)** — «Маэстра»
**30 (ндз)** — «Макбэт»
**1 (пн)** — «Таполевая завея»
**3 (ср), 4 (чц)** — «Пінская шляхта»
**5 (пт), 6 (сб)** — «Ядвіга»
**7 (ндз)** — «Маэстра»
*ранішнія спэктаклі*
**30 (ндз)** — «Афрыка»

# «Так рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак»

Джон Кунстадтэр, былы віцэ–пасол ЗША ў Менску, — ня толькі дыплямат, але й пранікліві фатограф, які адзначаецца здольнасьцяй заглядаць у глыбіню сваіх аб'ектаў. Пра гэта засьведчыла наладжаная ў штаб–кватэры ААН стараньнямі Беларускай місіі выстава фатаграфіяў, на якіх зафіксаваныя беларускія тыпы. Піша зь Нью–Ёрку **Янка Запруднік**.

Сп.Джон Кунстадтэр, былы віцэ–пасол ЗША ў Менску, — ня толькі дыплямат, але й пранікліві фатограф, які адзначаецца здольнасьцяй заглядаць у глыбіню сваіх аб'ектаў. Пра гэта засьведчыла наладжаная ў штаб–кватэры ААН стараньнямі Беларускай місіі выстава каля паўсотні чорна–белых фатаграфіяў, на якіх зафіксаваныя беларускія тыпы.

Адкрыцьцё двухтыднёвай выставы адбылося 17 лістапада.

Пабачыць фатаздымкі прыйшло каля сотні гасьцей. У сваім уступным слове пасол Беларусі ў ААН сп.Андрэй Дапкюнас падзякаваў прысутнаму намесьніку генэральнага сакратара ААН сп.Акасаку за прыхільнасьць да гэтага мерапрыемства ды падкрэсьліў значэньне выстаўленых экспанатаў. Гэтыя фатаздымкі, сказаў сп. Дапкюнас, не дакумэнтуюць падзеяў сусьветнага значэньня, якімі займаюцца дыпляматы. Затое фатограф здолеў ухапіць іншыя важкія рэчы — няўлоўныя промні сьвятла, якое выпраменьваецца ня з цэнтраў палітычнае ўлады, а з глыбіні людзкіх душаў.

Прыемна адзначыць, што фатограф цягам двух гадоў службы ў Менску добра авалодаў беларускай мовай, і гэтая аклічнасьць напэўна дапамагла яму ці мала ў ягоным фотазаглыбленьні ў дакумэнтаваныя аб'екты.

Сваё красамоўна праніклівае ўступнае слова сп. Кунстадтэр сказаў па–ангельску й па–беларуску.

Вось беларускі варыянт.

«Маё фатаграфічнае падарожжа па Беларусі няспынна натхняе і вядзе мяне па трох сьцежках.

Першая — стварэньне беларускага брэвіярыю ці кола году, а таксама хронікі новага нараджэньня веры, што адбываецца ў адметным беларускім асьвятленьні, напаўняецца адметным беларускім водарам глебы і адметным беларускім пачуцьцём повязі з радзімай.

Другая сьцежка — спроба адлюстраваць глыбокую, нязломную і — зноў жа — адметную і неад'емную эўрапейскасьць беларускай культуры, беларускай сутнасьці. Незьлічоную колькасьць разоў я быў сьведкам таго, што сэрца беларускае нацыі б'ецца ў кожным малым, нават у немаўляці, што мова нацыі сьпявае ў кожным жэсьце і кожнай усьмешцы, што беларусы сьціпла і непахісна спраўджваюць словы вялікага беларускага паэта Максіма Багдановіча: «Так кожная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак».

Я буду шчасьлівы, калі гэтыя мэлёдыі, гэтыя рытмы, гэтая руплівасьць адаб'юцца ў каторых са здымкаў на гэтай выставе.

Трэцяя сьцежка, спадзяюся, вядзе мяне да глыбейшага разуменьня повязі нашай нацыі і нацыі беларускай. Мы не былі б амэрыканцамі, калі б не лёсавызначальная дапамога пры Саратозе — і то ня толькі Тадэвуша Касьцюшкі, якога мы шануем як паляка і які ёсьць сынам беларускай глебы. Калі разважаць шырэй, трэба прыгадаць, што гонар нашай нацыі ў тым, што мы — нацыя простага чалавека. Кожны, хто вырас, як і я, у Чыкага ці ў Пітзбургу, Кліўлендзе ці любым іншым амэрыканскім горадзе сэрца Амэрыкі, ведае, як простыя беларусы і прадстаўнікі іншых нацый, што існавалі пад імпэрскім уціскам у тым жа рэгіёне — палякі, літоўцы, украінцы й шмат іншых, — прайшлі свой цяжкі шлях да Амэрыкі, як гэтыя годныя й працавітыя людзі сталі часткай нашай нацыі, як яны будавалі нашу нацыю, як яны адыгралі значную ролю ў вызначэньні, кім мы ёсьць і чаму. І калі на гэтай выставе мы глядзім на партрэты беларусаў, мы таксама ў некаторай ступені глядзім на саміх сябе.

Шаноўнае спадарства, дзякуй яшчэ раз за наведаньне сёньняшняга адкрыцьця і шанаваньне беларусаў — і тых, хто ёсьць на гэтай выставе, і тых, што на радзіме».

З чаркай добрага беларускага шампанскага, у ажыўленым абмене ўражаньнямі й думкамі, ня толькі з фатографам, але й з працаўнікамі Беларускае місіі, госьці прыемна правялі апраменены духовасьцю вечар.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Польскае кіно ў Менску

**З 26 па 30 ліпеня** Польскі інстытут запрашае гледачоў у кінатэатар «Цэнтральны» на Дні польскага кіно.

У чацьвер 27–ага — кінакамэдыя актора й рэжысёра Ежы Штура **«Надвор'е на заўтра»**. Юзаф Козел, які 17 гадоў таму ўцёк ад жонкі й сына ў кляштар, апазнаны роднымі падчас выступу манастырскага хору. Шакаваныя манахі выключаюць героя з ордэну — і ён адпраўляецца ў новую сям'ю з ужо дарослымі дзецьмі. Але старэйшая дачка Юзафа — удзельніца парнаграфічнага тэлешоў, сын (якога грае сын Ежы Штура) — піярнік–махляр, малодшая дачка — залежыць ад інтэрнэту й ня можа жыць без пігулак экстазі. Былы манах вырашае ўзяць сытуацыю ў свае рукі…

**«Карагод»** (пятніца, 28–ага) — яшчэ адзін фільм Ежы Штура. Герой драмы — студэнт Бартэк, які зарабляе на жыцьцё напісаньнем магістарскіх працаў. Аднойчы ў з купэ цягніку, дзе едзе герой, зьнікае пасажыр, пакінуўшы паліто. У кішэні раздаецца тэлефонны званок — і Бартэк падымае чужую слухаўку…

Герой драмы Анджэя Северына **«Хто ніколі ня жыў»** — малады ксёндз Ян (Міхал Жэброўскі), які нядаўна вярнуўся з Афрыкі, што пакутуе ад голаду й хваробаў. Герой пасьпяхова працуе з праблемнай моладзьдзю, але нечакана ў яго знаходзяць ВІЧ… Стужка дэманструецца ў суботу 29–ага.

Завяршаецца тыдзень камэдыяй **«Запаведнік»** Лукаша Палкоўскага. Вольны фатограф Марцін прыяжджае ў стары раён Варшавы, дзе мусіць падрыхтаваць здымкі аднаго кепска захаванага дому. Але герой зачараваны старым горадам, які не пазначаны ў афіцыйхных даведніках…

**Усе сэансы а 18.30. Уваход па бясплатных квітках, якія раздаваліся на пачатку тыдня.**

**Андрэй Расінскі**




## ЖАРТ

### Анэкдот ад Анемпадыстава

Сынок пытаецца: «Тата, а нас зачэпіць сусьветны фінансавы крызіс?» Тата: «Не, сынок, не зачэпіць. Ён багатых закране, а нам — гамон».

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### УЛАДЗІМЕР АРЛОЎ АЧУНЬВАЕ

**пасьля апэрацыі**, зробленай яму на сэрцы 6 лістапада хірургам Рэспубліканскага навукова–практычнага цэнтру «Кардыялёгія» Алегам Паланецкім. Пісьменьнік перадае падзяку мэдыкам, а таксама ўсім сябрам, знаёмым і незнаёмым людзям, калегам–літаратарам, журналістам, дыпляматам і палітыкам, якія падтрымалі яго ў першыя пасьляапэрацыйныя дні сваімі тэлефанаваньнямі, эсэмэскамі, тэлеграмамі і візытамі. Найбліжэйшыя тыдні Ўладзімер Арлоў будзе знаходзіцца на рэабілітацыі ў Аксакаўшчыне пад Менскам, дзе мае намер працаваць над новай кнігай.

### БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ

**Правядзем** беларускае вясельле з элемэнтамі традыцыйнага абраду, народнымі танцамі і дудой. Т.: (029) 704–00–18

### ДЗІЦЯЧЫ САДОК ПА-БЕЛАРУСКУ Ў СУХАРАВЕ

**Шукаю бацькоў**, якія жадаюць з восені 2009 г. аддаць сваіх дзяцей 3—4 гадоў у беларускамоўны гурток у мікраараёне Сухарава г.Менску. Арганізацыйныя (і кантрольныя) абавязкі бяру на сябе. Зьвязвацца: (029) 395–73–99 (Дар'я) або праз акаўнты скайп і гмэйл — apalonik

### КНІГІ

**Адам Станкевіч** «Выбранае» — 44–я кніга праекту «Беларускі кнігазбор» ужо ў кнігарнях і ў распаўсюднікаў

**Антон Луцкевіч**. «Выбраныя творы» — апошнія экзэмпляры ў Акадэмічнай кнізе

### ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

**Урокі** выяўленчага мастацтва. Рыхтую да паступленьня ў мастацкія вучэльню, каледж. Т.: (029) 306–33–17, (029) 551–32–36


# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакязу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

### Дзякуй

**Уладзіславу К.** зь Верхнядзьвінскага раёну.
**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.
**Валянціне А.** з Талачынскага раёну.
**Міхаілу М.** з Стаўпецкага раёну.
**Уладзімеру В.** з Смургонскага раёну.
**Валеру П.** з Баранавіцкага раёну.
**А.Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**М.Б., Н.К., Ірыне Ш., Міхаілу К.** з Жыткавіцкага раёну.
**Уладзіславу І., Мікалаю Л.** зь Віцебску.
**І.Ш.** з Браслаўскага раёну.
**Сяргею Л.** зь Берасьця.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Турцыя.** Цяпер султан, можна сказаць, ня мае войска, бо младатуркі адабралі ад яго каманду над усімі палкамі, разумеючы добра, што Абдул–Гамід мог бы скарыстаць са сваёй уласьці, каб не дапусьціць розных свабод.

**«Наша Ніва». №24 ад 3 сьнежня 1908**


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 26.11.2008.
Замова № 6563.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.